

КАЛІ З ДОМУ НЕ ВЫЙДЗЕШ ПРАЗ ДЗВЕРЫ...



ЗНЕСЦІ ХАТУ — ТРЭБА ЗНАЦЬ...

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 КРАСАВІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 64 (28931)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей БОБРЫКАЎ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Дэмаграфічная сітуацыя ў нас дастаткова складаная. Зараз ідзе некамплект прызыўнога кантынгенту. Вядома, трэба пераглядаць пытанні адтэрміновак. Таму што такая колькасць адтэрміновак, асабліва па адукацыі, — гэта вельмі шмат. У недалёкім мінулым служылі ўсе, каму споўнілася 18 гадоў. І нічога страшнага, калі малады чалавек будзе служыць у арміі, нават калі прызавуць са студэнцкай лаўкі. Дрэнна, калі ёсць зброя, боепрыпасы, тэхніка, а валодаць ёю ніхто не ўмее. Радзіму абараняць трэба ўмець кожнаму, я лічу».*

# ПТУШЫНЫ ДВОР



Былы наваполацкі тэхнік-тэхнолаг, а цяпер жыхарка вёскі Захарнічы Полацкага раёна Галіна ШТУКІНА, выйшаўшы на пенсію, захапілася выразаннем птушак і жывёл з фанеры і стала ўпрыгожваць імі фасад дома, свайго падворка, кветнікаў. Зімовымі вечарамі з дапамогай звычайнага лобзіка жанчына выпільвала і размалёўвала пеўняў, буслоў, зайцаў, вавёрак. А цяпер, з надыходам вясны, на кожную граду яна заўсёды ставіць кагосьці з гэтых персанажаў, тым самым надаючы сваёй сядзібе радасны, незвычайны настрой.

А тры гады таму на ўскрайку агарода Галіны «пасяліліся» і экзатычныя птушкі — паўліны, якіх умелая жанчына зрабіла са звычайных пластыкавых бутэлек. Прыгожыя птушкі сталі візітнай карткай не толькі сядзібы Штукіных — усёй вёскі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• Праект дакумента аб адмене ўказа аб ільготах у прадпрымальніцтве знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

• **Учора ва ўзросце 88 гадоў ад спынення сэрца памёр народны артыст СССР, лаўрэат шматлікіх прэмій і ўзнагарод, рэжысёр Георгій Данелія. Ён быў рэжысёрам такіх знакамітых фільмаў, як «Я крочу па Маскве», «Міміно», «Асенні марафон», «Кін-дза-дза!».**



• Колькасць рэзідэнтаў ПВТ перавысіла 1500.

• **11—19 красавіка ў Беларусі пройдзе акцыя «Чысты вадаём».**

• У Светлагорскім раёне з-за неасцярожнасці суседа пры абыходжанні з агнём згарэлі чатыры будынкі і пчальнік дачніка.

ISSN 1990 - 763X

# ТЫСЯЧА ДРЭЎ І АДЗІН ГАДЗІННІК

### Калі падрыхтоўка да падзеі плаўна пераходзіць у саму падзею

Брэст 1000 год!

**У Брэсце зараз у кожнай газеце ці не ў кожным выпуску навін мясцовых тэлестудый, на гарадскіх форумах гучыць словазлучэнне «падрыхтоўка да 1000-годдзя горада». Але гэта, відаць, не зусім дакладная фармулёўка. Калі будаўніцтва мастоў і дарог яшчэ можна назваць падрыхтоўкай, бо прадугледжаны канкрэтныя тэрміны здачы аб'ектаў з усім належным антуражам, то іншыя кампаніі больш правільна будзе назваць святкаваннем, альбо кампаніяй, прысвечанай тысячагоддзю. А гэта значыць, што 1000-гадовы юбілей Брэста не можа быць асобным днём альбо нават святочным тыднем, ён ужо адзначаецца самымі рознымі мерапрыемствамі і падзеямі.**

СТАР. 4



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Электронная камерцыя

# МІНІ-ЦЭНЫ ПАЧЫНАЮЦЬ І ВЫЙГРАЮЦЬ

### Лідарам інтэрнэт-гандлю ў нашай краіне становіцца кітайская пляцоўка

**Аб гэтым паведаміў кіраўнік маркетплэйса Deal.by Максім Марыніч на найбуйнейшай штогадовай канферэнцыі па электроннай камерцыі ў Беларусі E-commerce Day.**

### За год таваразварот у е-камерцыі павялічыўся на 20 %

Па звестках найбуйнейшай гандлёвай інтэрнэт-пляцоўкі краіны, летась мы выдаткавалі на тавары і паслугі ў сецыве на 20 % больш, чым год таму — 1,352 млрд рублёў (643,8 млн долараў). А вось доля інтэрнэт-гандлю ў рознічным таваразвароце краіны склала 3 %. Для параўнання: у суседніх Расіі і Украіне гэты паказчык ужо роўны 5 % і 7 % адпаведна. Эксперты прагназуюць, што сёлета беларускі рынак e-commerce працягне расці. Асноўны рост забяспечыць узмацненне канкурэнцыі сярод гульцоў, яна стымулюе іх паляпшаць якасць сэрвісу і прыцягваць больш кліентаў.

### Электронныя пакупкі робіць палова беларусаў

Паводле даследавання e-data.by, за год колькасць беларусаў, якія здзяйсняюць пакупкі ў інтэрнэце, павялічылася на 4 %. У перыяд з сакавіка мінулага года да сакавіка 2019-га 49 %, ці 4,7 млн, жыхароў краіны купілі нешта анлайн. Больш за ўсё такі шопінг папулярны ў Мінску і Мінскай вобласці. У цэнтральным рэгіёне каля 37 % жыхароў рэгулярна купляюць у сецыве. Найменш распаўсюджаны інтэрнэт-пакупкі ў Гродзенскай вобласці: там такімі е-крамамі карыстаюцца 22 % насельніцтва.

СТАР. 4

# ПРЭЗІДЭНТ ПРЫЗНАЧЫЎ ВІЦЭ-ПРЭМ'ЕРА

**Ім стаў Уладзімір Дворнік, які з 29 снежня 2010 года ўзначальваў Гомельскі абласны выканаўчы камітэт.**

Кіраўнік дзяржавы прытрымліваецца думкі, што Уладзімір Дворнік дастаткова дасведчаны чалавек, які прайшоў добрую школу. «Не толькі абласнога ўзроўню, што вельмі важна для любога, хто ідзе працаваць ва ўрад, тым больш адным з кіраўнікоў урада», — адзначыў ён.

У кар'еры новапрызначанага намесніка прэм'ер-міністра здараліся розныя выпрабаванні, нагадаў беларускі лідар. «І гузы набівалі там, і падалі, і падымаліся. Усё ў вас было — а гэта каштоўны вопыт, які спатрэбіцца на рабоце віцэ-прэм'ерам. Таму я яшчэ раз пацвярджаю свой намер прызначыць вас віцэ-прэм'ерам, які будзе курыраваць сельскую гаспадарку, прыродныя рэсурсы, ахову навакольнага асяроддзя. Лес таксама ў вас. Гэта значыць, тое, з чым вы ўвесь час сутыкаліся ў сваёй рабоце», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што не ён прыдумаў практыку ратацыі.

«Прынцып ратацыі быў краевугольным каменем работы з кадрамі і ў савецкія часы. Можа, так не называюць на Захадзе гэтыя пытанні, але кіраўнік краіны, дзе больш-менш стабільна ў кадравым дачыненні, праводзіць ратацыю. Таму кіраўніку Адміністрацыі пастаўлена задача ўносіць прапановы па ратацыі кадраў. Нядаўна ў МУС чарговы раз адбылася ратацыя. Людзі павінны неяк рухацца і па вертыкалі, і па гарызанталі», — прызнаў беларускі лідар. Такі час, упэўнены Прэзідэнт, прыйшоў і для губернатара Гомельскай вобласці.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў сваё стаўленне да гэтага рэгіёна і яго жыхароў: «Яно заўсёды было не проста ўважлівым — я з вялікай любоўю стаўлюся да людзей, таму што ў свой час і пацярпелі яны вельмі, і выкарабкваліся мы разам з гэтай бяды. Гомельская вобласць ужо не тая, што была, хоць не без праблем, гэта натуральна, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я думаю, што мы знойдзем годную замену разам з вамі на пасаду губернатара Гомельскай вобласці. Я вас прасіў учора ў размове па тэлефоне, каб вы запрасілі да сябе свайго першага намесніка па рабоце ў Гомелі і памочніка Прэзідэнта і каб яны ўдвух прыгаліся і працавалі ў Гомельскай вобласці, пакуль не будзе афіцыйна вырашана пытанне па губернатары».

Таксама Прэзідэнт дадаў, што нават пры прызначэнні віцэ-прэм'ерам і некалькі іншай зоне адказнасці Гомельшчына ўсё роўна застаецца да канца года за Уладзімірам Дворнікам у кадравых адносінах, каб дапамагчы ўвайсці ў курс справы новаму кіраўніку вобласці і іншым новым людзям. «Каб яны мелі магчымасць задаць пытанні, пракансультавацца ў вас па тых ці іншых пытаннях, ну і рухацца наперад», — сказаў ён.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### Даведка

**Уладзімір Дворнік нарадзіўся 16 красавіка 1963 года ў вёсцы Ровенская Слабада Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, па прафесіі ветэрынарны ўрач. З'яўляецца генерал-маёрам запасу і лаўрэатам прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне працы, навукі і тэхнікі.**

**Працаваў трактарыстам калгаса імя Дзяржынскага Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці, галоўным ветэрынарным урачом калгаса «Усход» Нараўлянскага раёна, галоўным ветэрынарным урачом, намеснікам старшыні калгаса «Дружба» Мазырскага раёна, галоўным дзяржаўным ветэрынарным урачом Мазырскага раёна, дырэктарам РУП «Саўгас — камбінат «Зара» Мазырскага раёна Гомельскай вобласці.**

**Абіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу трэцяга, чацвёртага і пятага скліканняў. Акрамя таго, з'яўляўся старшынёй Мазырскага райвыканкама ў 2009—2010 гадах.**

# СПРАВЫ СУСЕДСКІЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з украінскім палітыкам, кіраўніком палітрады партыі «Апазіцыйная платформа — За жыццё» Віктарам Медведчуком.**

Па словах кіраўніка дзяржавы, ён быў рады сустрэцца з Віктарам Медведчуком, асабліва пасля гарачых палітычных падзей ва Украіне. Беларускі лідар пацікавіўся ў суразмоўніка яго меркаваннем пра тое, чаго чакаць ад гэтай краіны ў перспектыве. «Для мяне вельмі важна, можа, нават не менш, чым для вас, таму вельмі цікавыя вашы развагі на гэты конт і іншыя пытанні», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У адказ украінскі палітык расказаў, што раніцай перад сустрэчай з Прэзідэнтам Беларусі жартам казаў пра тое, што ў адрозненне ад усіх іншых грамадзян Украіны мае ўнікальны шанц дакладна даведацца ўжо цяпер, хто пераможа на прэзідэнцкіх выбарах 21 красавіка, калі адбудзецца другі тур.

Віктар Медвядчук нагадаў пра падзеі «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» — тады кіраўнік дзяржавы ў адказ на адно з пытанняў прааналізаваў будучыя выбары і прадказаў, што ў другі тур выйдуць Пётр Парашэнка і Уладзімір Зяленскі.

«Я вам хачу сказаць, што 1 сакавіка ў нас ні адзін эксперт, ні адзін сацыёлаг, ні адзін палітык не мог сказаць дакладна, хто выйдзе ў другі тур», — дадаў ён.

**Паводле БелТА.**

# Зацікаўленасць у фінансаванні беларускіх праектаў

**Учора ў рамках рабочага візіту генеральнага сакратара Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы Раберта Антаніёне ў Беларусь адбыўся семінар для патэнцыйных бенефіцыяраў міжнароднай тэхнічнай дапамогі ЦЕІ.**

Спадар Антаніёне ў вітальным слове сказаў, што арганізацыя зацікаўлена ў фінансаванні самых розных праектаў у нашай краіне.

У семінары прынялі ўдзел прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх арганізацый, прадстаўнікі сістэмы адукацыі, культуры, навукі, аховы здароўя і іншыя. Удзельнікі змаглі падрабязна азнаёміцца з дзейнасцю ЦЕІ, а таксама з алгарытмам падачы праектных заявак для атрымання суфінансавання.

Цэнтральна-Еўрапейская ініцыятыва сёлета адзначае 30-ю гадавіну з дня свайго заснавання. Сёння ў складзе гэтай арганізацыі налічваецца 18 краін. Беларусь стала ўдзельнікам ЦЕІ ў чэрвені 1996 года. Па словах начальніка ўпраўлення агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва Міністэрства замежных спраў Рамана Раманоўскага, за гэты час у краіну было прыцягнута больш за 8 млн еўра пад праекты ў сферы эканомікі, навуковых даследаванняў, адукацыі, культуры, СМІ і іншых галінах. Сёння Беларусь разглядае арганізацыю як эфектыўны інструмент пашырэння і ўмацавання рэгіянальнага супрацоўніцтва праз рэалізацыю сумесных праектаў па актуальных кірунках дзейнасці, уключаючы альтэрнатыўную энергетыку, устойлівае развіццё, экалогію і развіццё новых тэхналогій.

**Вольга ПРАЛЮК.**

Пасля «Вялікай размовы»

# ВЫХАД У ЭФІР

**Некаторыя пытанні, якія паступілі ад жыхароў Беларусі ў ходзе падрыхтоўкі «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», датычыліся работы айчынных тэлевізійных каналаў. Міністэрства інфармацыі дало на гэтыя пытанні грунтоўныя адказы.**

Так, гледачоў турбуе зместавы кантэкст тэлеперадач і фільмаў, якія дэманструюцца ў эфіры. **Ірына БЕРАСТАВА з Мінска** абураецца перавагай фільмаў, якія ўтрымліваюць сцэны забойства і гвалту, а кіно і перадач са «светлымі, добрымі, гуманнымі» сюжэтамі бракуе. Яшчэ адзін **жыхар сталіцы Анатоль КАНАРСКІ** незадаволены зместам забаўляльных і палітычных ток-шоу, якія рэтранслююцца з расійскіх тэлеканалаў.

На гэта ў Мінінфарме адказваюць, што «пытанні напаўнення эфірнага часу адносяцца да ўнутранай палітыкі тэлеканалаў, якія, у сваю чаргу, пры фарміраванні эфірнай сеткі зыходзяць, перш за ўсё, з меркаванняў рэйтынга тэлевізійнай прадукцыі. Разам з тым у тэлеканалаў ёсць разуменне, што сённяшняя аўдыторыя гледачоў — складаная, шматпрофільная структура, дзе ў кожнага асобнага гледача ёсць свае запыты, перавагі і патрабаванні да тэлевізійнага кантэнту. У эфіры беларускіх тэлеканалаў прадстаўлены фільмы і праграмы рознай жанравай накіраванасці, у тым ліку культурна-асветніцкай, дакументальныя фільмы пра вядомых асоб і гістарычныя падзеі, актыўна транслюецца савецкая кінакласіка. Выходзіць у эфір шэраг тэлепраграм для падлеткаў і моладзі».

Што датычыцца рэтрансляцыі расійскіх тэлеканалаў, міністэрства адзначае, што «з 1 снежня 2018 года ўступілі ў сілу папраўкі ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі», у якіх, сярод іншага, прадугледжваецца павялічэнне долі нацыянальнага (беларускага) кантэнту да 30 % да 2020 года. Адпаведна, колькасць тэлепрадукцыі беларускай вытворчасці будзе павялічвацца. У перспектыве магчыма і паступовае павелічэнне абавязковай долі нацыянальнага кантэнту». Разам з тым «абмежаванне трансляцыі таго ці іншага тэлепрадукту ў Рэспубліцы Беларусь магчыма пры наяўнасці на гэта прававых падстаў». (Такімі падставамі можа быць размяшчэнне ў эфіры інфармацыі аб незарэгістраваных у нашай краіне прадпрыемствах, рэкламы наркотыкаў, інструкцый па вырабе зброі і да т. п.)

Некалькі зваротаў, у прыватнасці **Вячаслава НОВІКА са Жлобіна і Віктара КАЧАРГІ з Гродна**, датычыліся вялікай колькасці рэкламы ў эфіры. На што Мінінфарм адказвае: «Патрабаванні да рэкламы ў складзе тых ці іншых тэлепраграм вызначаны ў артыкуле 11 Закона аб рэкламе. Усе ўмовы размяшчэння рэкламы ў СМІ вызначаюцца ў дамове паміж рэдакцыяй тэлепраграмы і рэкламадаўцам. Адначасова лічым неабходным адзначыць, што беларускімі нацыянальнымі тэлеканаламі рэалізуецца цэлы шэраг тэлепраектаў пра дасягненні калектываў, прадпрыемстваў, фірмаў, прадпрымальнікаў, фермераў, пра развіццё рэгіёнаў і гарадоў. Вялікая ўвага аддаецца тэматыцы здаровага ладу жыцця, прапагандзе сямейных каштоўнасцяў, пытанням абароны мацярынства і дзяцінства. У эфіры тэлеканалаў рэгулярна транслююцца сацыяльныя відэаролікі. Усе гэтыя сацыяльна арыентаваныя праекты рэалізуюцца за кошт рэкламных паступленняў у бюджэт рэдакцый СМІ».

**Даніїл РАМАНАЎ з Буда-Кашалёва** пацікавіўся: чаму галоўныя нацыянальныя тэлеканалы не ствараюць забаўляльных і музычных праектаў, адаптаваўшы фармат папулярных замежных тэлепраграм («Голас», «Х-фактар»)? «Намеснікам прэм'ер-міністра Ігарам Петрышэнкам 18 лютага 2019 года даручана Міністэрству культуры сумесна з Белтэлерадыёкампаніяй разгледзець пытанне аб стварэнні нацыянальнага тэлевізійнага праекта фармату шоу «Голас» ці «Х-фактар». Інфармацыя аб выхадзе новых праектаў будзе размешчана ў эфіры тэлеканалаў», — адказалі ў Мінінфарме.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Зяленскі ў першым туры набраў галасоў больш, чым Парашэнка і Цімашэнка разам узятыя



Кандыдат у прэзідэнты Украіны ад партыі «Слуга народа» Уладзімір Зяленскі пасля апрацоўкі ўсіх электронных пратаколаў першага тура галасавання атрымаў большую падтрымку, чым дзейны кіраўнік дзяржавы Пётр Парашэнка і лідар «Бацькаўшчыны» Юлія Цімашэнка разам узятыя, якія занялі другое і трэцяе месца адпаведна.

У чацвер вечарам Цэнтрвыбаркам Украіны паведаміў, што пасля апрацоўкі 100 % электронных пратаколаў галасавання Уладзімір Зяленскі ў першым туры атрымаў 30,24 % галасоў, дзеючага прэзідэнта краіны Пятра Парашэнку падтрымалі 15,95 % выбаршчыкаў, лідара «Бацькаўшчыны» Юлію Цімашэнку — 13,4 %, кандыдата ад «Апазіцыйнай платформы — За жыццё» Юрыя Бойку — 11,6 %. Іншыя кандыдаты не пераадолелі бар'ер у 10 % электаральнай падтрымкі.

### Іран ніколі сур'ёзна не спадзяваўся на дзяржавы Еўропы

«Тэгеран ніколі не ўскладаў вялікіх спадзяванняў на еўрапейцаў у плане выканання імі пагаднення па іранскай ядзернай праграме», — сказаў кіраўнік іранскага МЗС Махамад Джавад Зарыф.

Па словах Зарыфа, апошнім часам, асабліва пасля выхаду ЗША з СУПД, «Іран факусуе сваю ўвагу на супрацоўніцтве з суседнімі краінамі, якія з'яўляюцца традыцыйнымі партнёрамі Тэгерана і застаюцца побач з ім у цяжкіх сітуацыях, такімі як Расія, Кітай, Турцыя і Ірак».



Еўрапейскія дзяржавы з самага пачатку разглядалі СУПД як вялікае дасягненне, аднак, як лічыць іранскі міністр, «яны, верагодна, не былі дастаткова моцныя, каб абараніць гэтае пагадненне». «Безумоўна, у краін Еўропы не было такіх магчымасцяў, каб супрацьстаяць санкцыям з боку ЗША», — дадаў Зарыф.

На мінулым тыдні амерыканскія ўлады чарговы раз пашырылі санкцыйныя спісы па Іране. Яны дадалі ў іх дзевяць фізічных асоб і 14 арганізацый, якія маюць дачыненне, на думку Вашынгтона, да тэрарыстычнай дзейнасці і іранскай ядзернай праграмы.

Прыёмная кампанія — 2019

# Графік для абітурыентаў ВНУ

## Вызначаны тэрміны правядзення ўступнай кампаніі ва ўстановах вышэйшай адукацыі


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Прыёмныя камісіі будуць прымаць дакументы з 12 да 17 ліпеня. У гэтыя тэрміны вызначыцца з выбарам спецыяльнасці павінны ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.**

*Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ, дакументы будуць прымацца:*

**з 12 да 31 ліпеня** — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

**з 12 ліпеня да 2 жніўня** — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

**з 12 ліпеня да 4 жніўня** — ва ўсіх іншых установах вышэйшай адукацыі.

Тэрміны падачы дакументаў для выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці пасля праходжання гутаркі, — з 12 да 14 ліпеня (як для асоб, якія паступаюць на «бюджэт», так і на платнай аснове).

**А з 18 ліпеня** распачынаюцца уступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаныя тэрміны навучання. Уступныя іспыты арганізаваны толькі ў адну сесію: як для асоб, што паступаюць за кошт сродкаў бюджэту, так і на платнай аснове.

*Уступныя выпрабаванні пройдуць у наступныя тэрміны:*

**з 18 да 21 ліпеня** — ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

**з 18 да 26 ліпеня** — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

**з 18 да 24 ліпеня** — у іншых ВНУ.

**з 18 да 25 ліпеня** — у ВНУ сельскагаспадарчага профілю пры паступленні на дзённую форму навучання.

Тэрміны залічэння на «бюджэт» наступныя: да 24 ліпеня — у ВНУ сілавых ведамстваў, да 28 ліпеня — у творчых, сельскагаспадарчых і іншых ВНУ.

Прыём дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору будзе весціся ў ВНУ сілавых ведамстваў з 26 да 28 ліпеня (залічэнне да 30 ліпеня), у творчых ВНУ — з 30 да 31 ліпеня (залічэнне да 1 жніўня) і ў іншых ВНУ — з 30 ліпеня да 1 жніўня (залічэнне да 3 жніўня).

Тэрміны залічэння на платную форму навучання ў ВНУ сілавых ведамстваў — да 2 жніўня, у творчых ВНУ — да 3 жніўня, у іншых ВНУ (акрамя завочнай формы навучання ў сельскагаспадарчых ВНУ) — да 6 жніўня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# НАС УЗРАДУЕ АКТЫЎНАЕ СОНЦА

## На выхадныя будзе не проста сонечна, а дастаткова цёпла — да плюс 17 градусаў


Фота Івана КУПАРВАСА.

**На гэтым тыдні антыцыклон падарыў нам бясхмарнае надвор'е. Хоць у начныя гадзіны пры ясным небе падмарожвала, але вось удзень паветра істотна падаграваўся. У наступныя двое сутак у асноўным захаваецца ўплыў антыцыклону, але ў апошні дзень тыдня тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам атмасферных франтоў, якія змяшчаюцца з Заходняй Еўропы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу будзе камфортна, толькі па крайнім паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра складзе ўдзень па краіне ад плюс 10 да плюс 16 градусаў. Суха і цёпла будзе ў суботу. Тэмпература паветра ў ноч на суботу ў асноўным складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, па паўночным усходзе пры праясненнях паветра астудзіцца да 6 марозу. Удзень будзе 7—14 цяпла. У паўднёва-заходніх раёнах краіны ў гэты дзень будзе цяплей: уначы ад плюс 4 да плюс 5 градусаў, удзень — 15—17 цяпла. І ў нядзелю ўначы ў асноўным захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, а вось удзень адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, які змяшчаецца з боку Заходняй Еўропы. Таму ўначы ў паўднёва-заходніх, а ўдзень і ў цэнтральных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, па паўночным усходзе пры праясненнях панізіцца да мінус 3 градусаў. Удзень будзе 9—15 цяпла, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах краіны паветра прагрэецца да плюс 17 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак атмасферны фронт прынясе кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 да плюс 8 градусаў. Удзень будзе 8—14 цяпла, на поўдні краіны цяплей — да плюс 15—17 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Аты-баты

# Агонь, батарэя!

**У пачатку красавіка на палігоне пад Барысавам праходзіць тактычнае вучэнне са 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгадай. Яго тэмай стала падрыхтоўка і рэалізацыя баявых дзеянняў у абарончай аперацыі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання. На вучэнні задзейнічана больш як 1100 ваеннаслужачых і 130 адзінак баявой тэхнікі. У ліку апошняй — каля 40 танкаў і 60 баявых машын пяхоты.**

— Беларусь прытрымліваецца прынцыпу транспарэнтнасці, і таму на вучэнне былі запрошаны прадстаўнікі краін НАТА — Германіі, Эстоніі, Латвіі, Літвы, Польшчы, а таксама ваенныя аташэ, якія маюць акрэдытацыю пры Міністэрстве абароны, — адзначыў **начальнік упраўлення верыфікацыі дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва Міністэрства абароны Андрэй ЦАРЫК.** — Гэта самая буйная ваенная дзейнасць сёлета на тэрыторыі Беларусі.

Кіруе вучэннямі **камандуючы войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання генерал-маёр Андрэй ЖУК.**

— Мы адпрацавалі два пытанні, якія датычыліся вядзення абароны і падрыхтоўкі да яе. Асабовы склад адбіваў атакі на пярэдні край — ацэнку дзеянням падраздзяленняў дадзім тады, калі будуць выкананы ўсе задачы, але магу ўжо цяпер сказаць, што брыгада падрыхтавана добра і здольная выканаць задачы, якія перад ёй пастаўлены. Таксама мы аддалі ўсебаковую ўвагу тыламу, тэхнічнаму, медыцынскаму забеспячэнню. А для карэкціроўкі агню мы выкарыстоўваем беспілотныя комплексы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Здарэнні

## З ІНТЭРНАТА ЭВАКУІРАВАЛІ 286 ЖЫЛЬЦОЎ

**У будынку інтэрната Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Наваполацку ноччу спрацавала сігналізацыя.**

Калі да месца выкліку прыбылі ратавальнікі, назіралася задымленне на першым паверсе ў пяціпавярховым будынку. Адбылося загаранне ў памяшканні электрашчытавой. У калідорах інтэрната ўстаноўлены дымавыя апавяшчальнікі, якія спрацавалі. Ратавальнікі сумесна з персаналам інтэрната эвакуіравалі 286 чалавек (з іх 27 непаўналетніх). Пацярпелых няма, пажар быў лакалізаваны і ліквідаваны.

## ПАЦЯРПЕЛА, РАТУЮЧЫ КАТА

**Мінчанка звярнулася да ратавальнікаў з просьбай аб дапамозе яе дачцэ.**

Высветлілася, што ў доме па праспекце Ракасоўскага 23-гадовая дзяўчына вырашыла самастойна скокнуць па жывёлу на казырок пад'езда на ўзроўні другога паверха з акна на трэцім. Аднак пасля гэтага дапамога спатрэбілася ўжо ёй. Работнікі МНС знялі пацярпелую з казырка пад'езда, перадаўшы дзяўчыну брыгадзе «хуткай». Яна была шпіталізаваная з папярэднім дыягназам «чэрапна-мазгавая траўма лёгкай ступені і ўдар паясnúmнага аддзела».

**Сяргей РАСОЛЬКА**

Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», расположенное по адресу: 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А, настоящим информирует, что на основании решения наблюдательного совета от 2 апреля 2019 года осуществляется формирование реестра акционеров общества по состоянию на 10 апреля 2019 года для проведения внеочередного общего собрания акционеров 16 апреля 2019 года.

УНП 400052115

## Сталічны ЧАС

● Рэканструкцыю ўчастка набярэжнай Свіслачы ў Мінску плануецца распачаць у верасні — кастрычніку бягучага года, паведаміў дырэктар прадпрыемства «Гардарбуд» Аляксандр Ярошык у прэс-цэнтры БелТА. Спачатку плануецца давесці да ладу левы бераг ракі ад вуліцы Янкі Купалы да праспекта Незалежнасці, на правы бераг распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя, але канчаткова яна не зацверджана. Як паведамлялася, на ўчастку ў раёне вуліцы Камуністычнай трэба будзе замяніць усе інжынерныя сеткі, усталяваць новыя канструкцыі, якія ўмацоўваюць берагавую лінію, парапеты. Уладкаванне воднай артэрыі ў цэнтры Мінска ў свой час значна змяніла гарадское асяроддзе, але за мінулыя гады канструкцыі пазношваліся. У 2016 годзе прынята рашэнне найбольш аварыйныя ўчасткі берагавой лініі рэканструяваць, распрацаваны план мерапрыемстваў.

● Абсерваторыя мінскага планетарыя адкрыла сезон і запрашае з 21.00 да 23.00 палюбавацца ў тэлескоп на найбольш цікавыя нябесныя аб'екты, паведамілі БелТА ў планетарыі. Мінчане змогуць убачыць двайныя і кратныя зоркі, зорныя скопішчы, галактыкі, планеты, Месяц, Сонца. «Традыцыя бясплатных назіранняў у гэтым сезоне працягнецца, у вежы ўстаноўлены новы тэлескоп для вывучэння сонечнай актыўнасці», — расказалі ў планетарыі. Пры планаванні наведвання абавязкова трэба ўлічваць умовы надвор'я. Вячэрнія назіранні будуць праходзіць па серадах — нядзелях з 21.00 да 23.00, дзённыя — па суботах — нядзелях з 12.00 да 15.00

**Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж» сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров**

Собрание состоится 12 апреля 2019 года в 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А.

**Повестка дня**

1. О приобретении акций ОАО «Сантехэлектромонтаж» на баланс Общества.

Список акционеров для регистрации участников собрания составляется на 10 апреля 2019 года.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросу повестки дня собрания в рабочие дни (понедельник – пятница), начиная с 9 апреля 2019 года – по месту нахождения общества с 14.00 до 16.00.

Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.

Акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров – паспорт и доверенность.

Справки по телефону 8 0232 359 102.

УНП 400052115

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-56857 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), площадью 189,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Криничная, 1 с оборудованием: котел отопительный КСТБ-30, молниезащита, охранная сигнализация Аларм 6, пожарная сигнализация Л606 СПИ молния, ванна моечная, емкость

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423650100013001424, площадью 0,1668 га (назначение – для обслуживания магазина), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Криничная, 1. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадью 0,0022 га

Начальная цена продажи – 197 071 руб. (сто девяносто семь тысяч семьдесят один рубль) с учетом НДС

Сумма задатка – 19 700 руб. (девятнадцать тысяч семьсот рублей)

Продавец – Лидский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231300, г. Лида, ул. Фурманова, 19, тел. 8-0154-549-297

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 24 апреля 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3–209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 18 апреля 2019 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

# ТЫСЯЧА ДРЭЎ І АДЗІН ГАДЗІННІК

## Зялёны шум

Вось, скажам, даўно аб'яўлена акцыя «1000 дрэў да 1000-годдзя Брэста». Яна, дарэчы, пачалася яшчэ летась. І за гэты час пасаджана ўжо больш за чатыры тысячы дрэў. Асабліва актыўна вядзецца работа ў новым парку 1000-годдзя. Там прайшлі арганізаваныя пасадкі пад рознымі назвамі, напрыклад «Сямейнае дрэва». Садзілі свае алеі ветэраны і мытнікі, журналісты і таксісты. І не толькі ў названым парку, які разбіты ў новым паўднёва-заходнім раёне. У мікараёне Усход спартсмены пасадзілі «спартыўную» алею, у цэнтры паявіўся сквер «банкіраў» і алея «адвакатаў».

Вельмі часта гэтыя акцыі ўзначальвае **старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.** Так было ў адзін з выхадных дзён, калі працоўны дэсант на чале з мэрам садзіў алею на рагу вуліц Валгаградскай і Кастрычніцкай рэвалюцыі. Днямі ў мікараёне Паўночны пасадзіла дрэвы адміністрацыя Ленінскага раёна. Акцыю падтрымалі кіраўнікі ўстаноў, прадпрыемстваў, арганізацый раёна.

У гэты дзень на тэрыторыі былога Паўночнага ваеннага гарадка, які актыўна забудоўваецца, было пасаджана 60 рабін, бяроз і дубоў.

Вясна ж толькі пачынаецца, і наперадзе яшчэ шмат пасадак. Усяго запланавана пасадзіць больш за 22 тысячы дрэў. Так што акцыя «1000 дрэў» названая вельмі ўмоўна. І ўсе гэтыя прыгожыя акцыі сваёй мэтай ставяць прыцягненне ўвагі грамадскасці, падштурхоўваюць гараджан да ўдзелу ў агульнай справе. Асноўную работу па азеляненні робіць КУП ЖКГ. Яго работнікі кожны дзень высаджваюць дрэвы і кусты. Цяпер гэтыя дрэўцы яшчэ малыя, і іх наяўнасць у горадзе не вельмі паўплывае на знешні выгляд ды стан гарадскога асяроддзя. Але пройдзе нейкі дзясятак гадоў, і мы ўсвядомім, што гэта была, можа, найлепшая справа, зробленая да юбілею горада. Саджанцы падрастуць, узмацнеюць, прыбавяць кіслароду ў горадзе. Бо за апошнія гадоў дваццаць інтэнсіўнай забудовы дрэвы толькі і рабілі, што высякалі, каб вызваліць пляцоўку для новых кварталаў ды гандлёвых цэнтраў.

Працягваецца работа па аднаўленні старадаўняга Гарадскога сада. Не так даўно туды завезлі шматтонны камень-валун. Ён устаноўлены на ўзвышшы, хутка на ім з'явіцца шыльда. Валун стане своеасаблівым пунктам адліку парку.

## Зверка пазіцый

Аб усім гэтым гаварылася на пасяджэнні абласнога выканаўчага камітэта, дзе **старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** праінфармаваў кіраўніцтва вобласці аб рабоце гарадскіх службаў і грамадскасці горада напярэдадні святкавання юбілею. Як вядома, асноўныя мерапрыемствы па святкаванні прызначаныя на верасень. Кіраўнік гарадской улады паведаміў, што на навуковай аснове распрацаваная канцэпцыя мастацкага афармлення Брэста. Спецыялісты стварылі сістэму святочнага афармлення горада з ілюмінацыяй. Апошняе прымеркавана не толькі да юбілейных мерапрыемстваў, аснова канцэпцыі будзе выкарыстаная ў афармленні абласнога цэнтра і пазней.

На пасяджэнні выканкама таксама разгледзелі пытанне аб гатоўнасці аб'ектаў інфраструктуры і будаўніцтва да свят. Адзначалася, што ў горадзе рэкордныімі тэмпамі ідзе капітальны рамонт жылля, дарожнае будаўніцтва. Напрыклад, за тры гады капітальна адрамантавана 10 працэнтаў усяго жыллёвага фонду горада, альбо 122 дамы, заасфальтавана больш за 60 вуліц. У цэлым план мерапрыемстваў да святкавання 1000-годдзя Брэста, зацверджаны распараджэннем кіраўніка краіны, уключае 32 аб'екты будаўніцтва. Ужо ўведзена ў эксплуатацыю 13 з іх. У сціслыя тэрміны трэба завяршыць будаўніцтва яшчэ 19, якія ўключаны ў праграму. Усяго на рэалізацыю мерапрыемстваў плануецца выдзеліць каля 300 мільёнаў рублёў, за два гады з усіх крыніц фінансавання накіравана ўжо 200 мільёнаў.

Старшыня гарвыканкама расказаў, якая работа вядзецца дэпутатамі гарадскога Савета, грамадскасцю горада, якім удзел у агульнай справе прымаюць прадпрыемствы, арганізацыі, бізнес. Паводле яго слоў, праблемай пакуль застаюцца прыватны сектар, гаражныя кааператывы. Для навядзення поўнага парадку патрэбныя намаганні дэпутацкага корпуса, структур, якія маюць права прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці і ўказваць на недахопы шляхам накіравання прадпісанняў.


Фота Валерыі КАРАЛЯ.

## Арт-аб'ект на Набярэжнай

У Брэсце ледзь не кожны дзень паяўляюцца новыя цікавінкі, не кажучы пра вялікія і значныя аб'екты. Адзін з іх — сонечны гадзіннік, які нядаўна ўрачыста адкрылі. Такім чынам знайшла ўвасабленне даўняя задумка ўпрыгожыць Набярэжную. Запланаванае ўдалося ажыццявіць дзякуючы сумесным намаганням зацікаўленых з выкарыстаннем гарадскога бюджэту і суб'ектаў гаспадарання. І цяпер у горадзе на адзін арт-аб'ект стала больш. На гарадской набярэжнай ракі Мухавец час цяпер можна вызначаць па сонцы. Гадзіннік складаецца з 16 мініяцюр — славутасцяў абласнога цэнтра. Гэта музей «Бярэсце», Холмскія вароты крэпасці і галоўны ўваход у цытадэль, касцёл, вакзал, страчаная вежа старажытнага горада і іншыя.

Па новым гадзінніку можна вывучаць гісторыю, а таксама вызначаць час. Бо ў цэнтры бетоннага хранометра змешчана стрэлка з гербам горада, цень ад якой у сонечны дзень будзе падаць на цыферблат і такім чынам паказваць час.

На адкрыццё гадзінніка на беразе ракі сабралася шмат людзей. Аляксандр Рагачук падкрэсліў, што развіццё вуліцы Набярэжнай было вызначана некалькі гадоў таму ў якасці аднаго з трэндаў горада. Па ёй можна будзе дайсці да гарадскога саду, выйсці ў цэнтр і накіравацца далей — у крэпасць. А сама вуліца павінна жыць і стаць папулярным месцам, як, напрыклад, Савецкая. Апошняя, дарэчы, можа змяніць сваю назву на вуліцу 1000-годдзя. Такая грамадская ініцыятыва паявілася, яна набірае прыхільнікаў у сацсетках. Прапанова неўзабаве будзе разгледжана ў гарвыканкаме, за якім апошняе слова ў справе змены альбо захавання назвы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# МІНІ-ЦЭНЫ ПАЧЫНАЮЦЬ І ВЫЙГРАЮЦЬ



Часцей за ўсё мы з вамі здзяйсняем анлайн-пакупкі ў лакальных інтэрнэт-крамах: на айчынным рынку закупляюцца 90 % з тых, хто наогул купляе нешта анлайн. На другім месцы — інтэрнэт-крамы Кітая, там здзяйсняюць пакупкі 74 % беларускіх інтэрнэт-пакупнікоў. Далей ідуць е-крамы ЗША, Расіі і Польшчы: за апошні год у іх куплялі 5 %, 3 % і 3 % інтэрнэт-пакупнікоў адпаведна. Больш за 17 % анлайн-пакупнікоў адзначылі, што здзейснілі куплю, убачыўшы рэкламу ў сацсетках. Калі разглядаць сацыяльныя сеткі як асобны канал продажаў (па законе ў іх можна толькі рэкламаваць, а не прадаваць тавары), то яны займуць трэцяе месца па папулярнасці, саступіўшы толькі беларускім і кітайскім інтэрнэт-пляцоўкам.

## Расце попыт на паўсядзённыя тавары

Беларусы сталі часцей купляць у інтэрнэце рэчы, патрэбныя ў паўсядзённым жыцці: тавары для дзяцей, прадукты і тавары для жывёл. Адказваючы на пытанне, што вы купіце хутчэй анлайн, чым афлайн у будучыні, большасць выбраўшых гатовай ежы, квіткі на мерапрыемствы, тавары для будаўніцтва і рамонту, а таксама арэнду і куплю нерухомасці.

Галоўнымі прычынамі купляць у сеціве кліенты называюць меншыя цэны і большы выбар і асартымент, чым у звычайных крамах. Пры гэтым ступень уплыву такіх фактараў залежыць ад катэгорыі тавараў: пры куплі аўтатавараў анлайн людзі больш цэняць большы выбар і асартымент, а пры куплі дзіцячых тавараў — больш нізкія цэны.

На пэўныя катэгорыі тавараў у інтэрнэце дзейнічаюць стрымлівальныя фактары. Многія лічаць, што пры куплі адзення анлайн складана ўдакладніць важныя характарыстыкі, а пры куплі прадуктаў няма гарантыі захавання тэрмінаў і асаблівых умоў захоўвання.

## Кітайскі рынак збіў нашы цэны

На адну куплю ў інтэрнэце мы цяпер трацім у сярэднім 50 рублёў. У розных катэгорыях тавараў гэтая сума адрозніваецца: сярэдні чэк на тэхніку і электроніку роўны 100 рублям, мэблю і тавары для дома — 90 рублёў, адзенне, абутак і аксесуары — 40 рублёў, а тавары для дзяцей — каля 30 рублёў. Дык вось, за апошні год такі сярэдні чэк на адну куплю паменшыўся на восем рублёў. Гэта звязана з тым, што асартымент у анлайне пашыраецца больш таннымі таварамі, асабліва на кітайскіх сайтах.

Колькасць заказаў праз мабільныя прылады абганяе колькасць заказаў праз камп'ютары. Гэта павеў моды апошніх гадоў. Сёння, афармляючы заказы ў інтэрнэт-крамах, жыхары нашай краіны ў 40 % выпадкаў карыстаюцца мабільнымі праграмамі (плюс 16 % да паказчыка мінулага года). Аднак 35 % заказаў афармляюць праз сайты на ПК (мінус 19 % да паказчыка мінулага года) і 24 % — праз сайты на мабільных прыладах (плюс 2 %).

Эксперты адзначаюць, што рост папулярнасці мабільных праграм звязаны з развіццём у нас буйных маркетплэйсаў і інтэрнэт-крамаў, такіх як AliExpress, Joom і Wildberries.

## Аплата па факце

Жыхары краіны сталі на 8 % часцей аплачваць пакупкі ў электронных крамах па факце атрымання: наяўнымі, карткамі, у крэдыт і ў растэрміноўку. Сёння так разлічваецца ў 62 % выпадкаў. Другім па папулярнасці спосабам аплаты з'яўляецца бяспечная здзелка, даступная на замежных маркетплэйсах. З яе дапамогай аплачваюць 20 % пакупак.

Пры бяспечнай здзелцы пакупнік плаціць грошы не наўпрост інтэрнэт-краме, а пляцоўцы (напрыклад, AliExpress), якая пераводзіць іх прадаўцу пасля таго, як пакупнік пацвердзіць, што з купляй усё ў парадку. Беларускія маркетплэйсы змогуць увесці такую магчымасць пасля дазволу плацяжоў на карысць трэціх асоб. Адпаведны законапраект — закон «Аб плацежных сістэмах і плацежных паслугах у Рэспубліцы Беларусь» — цяпер праходзіць разгляд у Камітэце дзяржкантролю і Вярхоўным судзе.

## А з дастаўкай лепш самі

Паводле інфармацыі аналітыкаў, каля 34 % пакупак кліенты забіраюць самі ў паштовых аддзяленнях. Далей па папулярнасці — бясплатная дастаўка кур'ерам (29 %) і самавываз (16 %). Радзей за ўсё карыстаюцца платнай дастаўкай: кур'ерам (11 %) і ў аддзяленне пошты (10 %).

***

Паводле ацэнак экспертаў, нягледзячы на мытныя ліміты, тавараабарот AliExpress у Беларусі дасягае 200—250 млн долараў. Пры гэтым агульны аб'ём рынку інтэрнэт-гандлю летась склаў каля 645 млн долараў.

На другім месцы ў розных катэгорыях знаходзяцца мясцовыя гульцы — інтэрнэт-гіпермаркет 21vek, гандлёвая пляцоўка Wildberries. Адзіная катэгорыя, дзе лідзіруюць беларускія гульцы, — тавары штодзённага спажывання: «Е-дастаўка» і « Гіпермол».

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ❍ Даведка «Звязды»:

**e-data.by — даследчы праект, які збірае аналітычныя звесткі аб беларускім рынку электроннай камерцыі з розных крыніц. Каманда праекта правяла два даследаванні таго, як беларусы здзяйсняюць пакупкі ў інтэрнэце. Для даследаванняў былі апытаныя 1000 беларусаў, якія маюць досвед пакупак у інтэрнэце. Выбарка рэспандэнтаў рэпрэзентатыўная для насельніцтва краіны паводле полу, узросту і рэгіёна пражывання.**

**Deal.by — беларускі маркетплэйс, дзе прадстаўлены мільёны тавараў і паслуг ад кампаній і прыватных асоб. Deal.by дапамагае людзям па ўсёй краіне.**


**Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж».**
**Учетный номер плательщика: 400052115.**
**Вид экономической деятельности: строительство.**
**Адрес: Республика Беларусь, 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8А**

**Дополнительная информация об акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 1 января 2019 г.**

| | |
|---|---|
| Наименование аудиторской организации | Частное аудиторское унитарное предприятие «Бизнесаудитсервис» |
| Местонахождение (для организации – юридический адрес) | ул. Лепешинского, 22а, кв. 3в, г. Гомель, РБ |
| Дата государственной регистрации, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей | 02.11.2009, № 490440506 |
| Период, за который проводился аудит | 01.01.2018 – 31.12.2018 |
| Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушениях | По мнению аудита, прилагаемая бухгалтерская отчетность достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение ОАО «Сантехэлектромонтаж», по состоянию на 31.12.2018 г., финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь |
| Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме | ЕПФР 19.03.2019 |

УНП 400052115




## ПАДТРЫМАЎ НАЗЫВАЕЦЦА...

Цяпер у нашых навучальных установах шмат студэнтаў-замежнікаў. Гэта некалі было, што называецца, кот наплакаў: у прыватнасці, гадоў семдзесят таму на нашым беларуска-рускім аддзяленні філфака вучыўся хіба што паляк Эдвард. Хлопец ён быў свой, кампанейскі, мовы — і рускую, і беларускую — на спецыяльных курсах вучыў...

А месяцы праз два і праверка рыхтуецца: рассаджваюць нас, чалавек пяцьдзясят, у прасторнай аудыторыі, раздаюць праштампаваныя аркушы паперы, пачынаюць дыктоўку... Як зараз помню, тэкст — даволі складаны: урывак з рамана Пятра Паўленкі. А таму ўсе студэнты напружана слухаюць тэкст, карпеюць над паперай ды перачытваюць тое, што напісалася. Я ж да ўсяго раз за разам кручу галавой — падказваю нешта Эдварду, які спецыяльна ўладкаваўся побач...

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником**, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части») и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.10.2018 г. № 201 (28717). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Республиканского дочернего унитарного предприятия по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт» (продавец имущества) извещает о проведении 22 апреля 2019 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 80 % (лоты №№ 1–3), со снижением начальной цены на 50 % (лот № 4) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**Местонахождение (лоты №№ 1–4):** Гомельская область, Гомельский р-н, поселок Янтарный,12. **Примечание:** с учетом НДС 20 % (в соответствии с п.п. 2.3 ст. 93 НК РБ, при условии выполнения п. 6.11 Указа РБ № 294 от 04.07.2012 г.)

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Колонка маслораздаточная с дистанционным управлением, модель 367 М5ДЭ с напольной насосной установкой (инв. № 1856161) | **703,01** | 70,30 |
| 2 | Колонка маслораздаточная с дистанционным управлением, модель 367 М5ДЭ с напольной насосной установкой (инв. № 1856819) | **391,92** | 39,19 |
| 3 | Колонка маслораздаточная с дистанционным управлением, модель 367 М5Д (инв. № 6682) | **209,41** | 20,94 |
| 4 | Подъемник ПР-5 (инв. № 5925-г) | **1 069,82** | 106,98 |

**Продавец:** РДУП по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт», 247012, пос. Янтарный,12, Покоплюбичский с/с. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (0232) 99-33-87 – Лариса Ивановна. **Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (РДУП по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт»):** р/с: BY82 BLBB 3012 0490 3217 3000 1001 в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 490321730, назначение платежа – задаток за участие в аукционе за лот № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 5 апреля 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 18 апреля 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником**, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)». **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.10.2018 г. № 201(28817). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

### Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СПЕЦРЕМОНТ», 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13 |

**Предмет аукциона – оборудование, транспорт, спецтехника, расположенная по адресу г. Минск, Бетонный проезд, 11**

| Лот п/п | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска/дата принятия к бух. учету | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 27802 | Вращающийся лазер PR 25IF, 2009 г. | 1 680,00 | 84,00 |
| 2 | 21653 | Денситометр индикаторного типа ДНС (по маркировке на изделии ДНС-2), 2006 г. | 361,20 | 18,06 |
| 3 | 21529 | Дефектоскоп магнитопорошковый ПМД-70, 2006 г. | 1 512,00 | 75,60 |
| 4 | 21528 | Дефектоскоп магнитопорошковый ПМД-70, 2006 г. | 1 512,00 | 75,60 |
| 5 | 21524 | Дефектоскоп у/з УД4 Т, 2006 г. | 2 268,00 | 113,40 |
| 6 | 21527 | Дефектоскоп у/з УД4 Т, 2006 г. | 2 268,00 | 113,40 |
| 7 | 153 | Дефектоскоп ультразвуковой CTS-9006, 2013 г. | 5 880,00 | 294,00 |
| 8 | 21799 | Дистанционный лазерный измеритель PD-42, 2009 г. | 504,00 | 25,20 |
| 9 | 21702 | Дозиметр рентгеновского и гамма-излуч. ДКС-АТ1121, 2007 г. | 2 520,00 | 126,00 |
| 10 | 21635 | Камера сушильная КС 0,25/5,0-400, 2006 г. | 1 176,00 | 58,80 |
| 11 | 21531 | Нутромер НМ-4000, 2006 г. | 840,00 | 42,00 |
| 12 | 21530 | Нутромер НМ-2500, 2006 г. | 411,60 | 20,58 |
| 13 | 128 | Прибор ТКА-ПКМ, 2012 г. | 168,00 | 8,40 |
| 14 | 21636 | Рентгеновский аппарат «Ратмир» 190П, 2006 г. | 1 512,00 | 75,60 |
| 15 | 146 | Сварочный аппарат JASIK ARC 350, 2012 г. | 470,40 | 23,52 |
| 16 | 145 | Сварочный аппарат JASIK ARC 350, 2012 г. | 470,40 | 23,52 |
| 17 | 15001 | Станок вертикально-сверлильный 2Б125, 1990 г. | 604,80 | 30,24 |
| 18 | 5031 | Станок модельный ЗТ-634, 1988 г. | 840,00 | 42,00 |
| 19 | 5064 | Станок МП9-1695, 1996 г. | 2 436,00 | 121,80 |
| 20 | 21373 | Станок ножовочно-отрезной 872Н, 1981 г. | 285,60 | 14,28 |
| 21 | 21390 | Станок универсальный КСМ-180, 1994 г. | 1 176,00 | 58,80 |
| 22 | 21375 | Станок фрезерный 675П, 1981 г. | 2 604,00 | 130,20 |
| 23 | 21378 | Токарно-винторезный станок 1М61П, 1986 г. | 2 772,00 | 138,60 |
| 24 | 21525 | Толщиномер ультразвуковой ТУЗ-2, 2006г. | 243,60 | 12,18 |
| 25 | 21526 | Толщиномер ультразвуковой ТУЗ-2, 2006 г. | 243,60 | 12,18 |
| 26 | 165 | Толщиномер ультразвуковой CTS-30 B, 2014 г. | 655,20 | 32,76 |
| 27 | 21652 | Шкаф сушильный для р/пленки ШСРП, 2006 г. | 672,00 | 33,60 |
| 28 | 21523 | Эндоскоп гибкий ЭТГ-10-2.7, 2006 г. | 2 268,00 | 113,40 |
| 29 | 21762 | Агрегат сварочный TS300SC/EL400T23OMX3DEV с тележкой СТМ300 | 8 820,00 | 441,00 |
| 30 | 997 | Автомобиль грузовой бортовой, МАЗ 533603-220, 2007 г., рег. номер АВ 0450-7 | 6 296,64 | 314,83 |
| 31 | 118 | Автомобиль GAZ-2705, 2011 г., рег. номер АК 6489-7 | 7 173,60 | 358,68 |
| 32 | 21651 | Автомобиль ГАЗ 2752, 2006 г., рег. номер АА 6140-7 | 2 572,92 | 128,65 |
| 33 | 21676 | Автомобиль ГАЗ 2752, 2006 г., рег. номер АА 9651-7 | 2 572,92 | 128,65 |
| 34 | 104 | Автомобиль GAZ-2705, 2010 г., рег. номер АК 2060-7 | 6 636,84 | 331,84 |
| 35 | 21466 | Автобус-вагон GAZ-22171, 2001 г., рег. номер АК 3962-7 | 2 369,64 | 118,48 |
| 36 | 160 | Грузовой пикап UAZ 23632-136, рег. номер АН 3291-7 | 7 560,00 | 378,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Рудович Виктор Андреевич, тел. 8 029 647-94-47

Транспорт, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Климовичи, ул. Северная, д. 1

| Лот п/п | Инв. № | Наименование предмета аукциона | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|
| 37 | 5045 | Автомобиль RAF 2203, рег. знак 9988 АМ-7 | 1 188,00 | 59,40 |
| 38 | 6032 | Автомобиль ГАЗ 32213, рег. знак АА 3643-7 | 1 512,00 | 75,60 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Чурсин Сергей Геннадьевич, тел. 8 029 375-41-72

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 13.03.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **18.04.2019** в 11.30 по адресу: **г. Минск, Бетонный проезд, 17, ОАО «СПЕЦРЕМОНТ»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **15.04.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |


**ОАО «КОНДИТЕРСКАЯ ФАБРИКА «СЛОДЫЧ»**
**осуществляет реализацию следующей техники:**

✓ **ТРАКТОР МТЗ 82.1,**
1992 года выпуска, по цене 9 600,00 руб. без учета НДС.

✓ **АВТОМОБИЛЬ MAZDA 6,**
2004 года выпуска, по цене 6 760,00 руб. без учета НДС.

**Телефоны для справок:**
**8 (017) 398 97 37; + 375 29 355 20 67; + 375 29 121 0 441.**

**Место расположения объектов:**
**г. Минск, ул. Радиальная, 54/2.**

УНП 100129695

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** У панядзелак назапашаныя праблемы даводзецца вырашаць самастойна, на падтрымку і дапамогу з боку лепш не разлічваць. Паспрабуйце разабрацца ў неадкладных справах. У сераду вас пацешаць новыя сустрэчы і ўражанні, поспех у партнёрскіх адносінах. Аднак асцярожнасць у словах і дзеяннях не перашкодзіць, бо нядобразычліўцаў вакол нямала. Важная задача тыдня — упэўнена і своечасова зрабіць свой выбар.

**ЦЯЛЕЦ.** На тыдні асабліва значэнне набудуць такія якасці, як удумлівасць і сабранасць. Менавіта яны гарантуюць поспех у кар'еры. Калі ад-будуцца паездкі, то па справах, калі сустрэчы і знаёмствы, то карысныя, якія абяцаюць нядрэнныя перспектывы. Аднак у чацвер вас можа наведаць роспач, так што вельмі пажадана задушыць хандру ў зародку. Не блытайце неразуменне з канструктыўнай крытыкай: гэта зусім розныя рэчы. Заадно зможаце паправіць некаторыя свае слабыя месцы. Субота можа настроіць на больш высокія матэрыі і схіліць да адпачынку.

**БЛІЗНЯТЫ.** Першая палова тыдня абяцае быць вельмі спрыяльнай у многіх сферах дзейнасці. Высокая актыўнасць разам з цікавымі ідэямі дазволіць дасягнуць вынікаў, бачных няўзброеным вокам. Выкарыстоўвайце гэты перыяд для ўмацавання свайго ўплыву, атрымання прыбытку і развіцця асабістых ініцыятыў. У другой палове тыдня поспех перамесціцца ў сферу хатніх спраў і рамантычных адносін. Вы атрымаеце перамогі на асабістым фронце і пераканаецеся, што каханыя.

**РАК.** Не грэбуйце дробязямі, рашэнне здавалася б нязначных пытанняў можа даць нечаканы станоўчы вынік. Пажадана перастаць раствараецца ў патоках эмоцый і ўзяцца за нешта канкрэтнае. Аўторак — удалы дзень для рэалізацыі грандыёзных планаў і прыняцця сур'ёзных рашэнняў. Пошук новай работы ў чацвер можа завяршыцца поспехам. Але перш чым дзейнічаць, варта добра ўсё прадумаць, бессістэмныя крокі поспеху не прынясуць.

**ЛЕЎ.** Панядзелак абяцае быць удалым днём для зносін з калегамі і сябрамі. Нават уладальнікі самага складанага характару будуць мілыя і пакажуць сябе з найлепшага боку. На абяцанні, якія будуць атрыманы вамі ў пятніцу, асабліва спадзявацца не варта. Нядзеля — выдатны дзень для правядзення навуковых даследаванняў і эксперыментаў.

**ДЗЕВА.** Звыклы бег падзей можа быць парушаны нечаканасцямі, якія цалкам можна было прадбачыць. Будзьце напагатове, але нічога не прадпрымайце, пакуль не разберацеся што да чаго. Непажадана звязвацца з якімі-небудзь сумнеўнымі праектамі і рызыкаваць сваім дабрабытам. Залішняя самаўпэўненасць можа прывесці да непаразуменняў з калегамі і з начальствам. У выхадныя падарожжа абяцае ўдалы адпачынак у кампаніі.

**ШАЛІ.** На тыдні людзі могуць прынесці вам масу карыснай інфармацыі. Поспех чакае пры нетрадыцыйным падыходзе да вырашэння любых жыццёвых праблем. У другой палове тыдня старайцеся пераправяраць свае дзеянні, паперы і справаздачы. Вам неабходна праявіць зайздроснае цярпенне, інакш канкурэнты могуць скарыстацца вашай эмацыянальнасцю і справакаваць канфліктную сітуацыю.

**СКАРПІЁН.** Усё ў вашых руках. Вы самі павінны расставіць акцэнты. Лепш знізіць тэмп працы, каб пазбегнуцьператамлення. Усё роўна не атрымаецца прыбытак. У сераду не злоўжывайце сваім уплывам, будзьце больш ласкавымі з каханым чалавекам. Паспрабуйце зразумець апанентаў, прыслухайцеся да іх меркавання. У выхадныя лепш зладзіць нешта рамантычнае.

**СТРАЛЕЦ.** Накіруйце частку сваіх намаганняў на павышэнне прафесійнага статусу. Маючыя адбыцца дзелавыя сустрэчы і нарады будуць важныя і значныя для вас. З сярэдзіны тыдня раздражняльныя цяжкасці адступяць, і шлях наверх стане вольным. Загружанасць на рабоце не перашкодзіць праявіць разнастайнасць талентаў і ў іншых сферах жыцця.

**КАЗЯРОГ.** Ваша сур'ёзнае і добрасумленнае стаўленне да работы не можа застацца незаўважаным. У аўторак можа паступіць вельмі цікавая і сур'ёзная прапанова, цалкам здольная ўзвысіць вас у вачах вашага асяроддзя. Надыходзіць спрыяльны час для канкрэтных дзеянняў, адказных крокаў і змены работы. У чацвер можа сарваецца важная дзелавая сустрэча. Калі магчыма, лепш адразу назначце яе на іншы дзень.

**ВАДАЛІЎ.** На тыдні правілы гульні вызначаць будзеце вы. Так што, калі штосьці не падабаецца, значыць, вы проста наблыталі самі. Верагодна, давядзецца даволі шмат працаваць, затое вы хутка ўбачыце вынік. Час спрыяльны для новых спраў і праектаў, але гэта не значыць, што ўсё астатняе можа быць беспакарана закінута. Сваякі, магчыма, маюць патрэбу ў вашай дапамозе, аднак не факт, што вы гэтую дапамогу ў стане аказаць.

**РЫБЫ.** Пачынаецца паступовае змяненне вашага стылю жыцця, лёс можа даць некалькі новых шанцаў. У аўторак і сераду вашым тайным ворагам можа стаць залішняя крытычнасць, якая перашкодзіць ажыццяўленню планаў. Лепш усё ж такі быць дыпламатам. У другой палове тыдня накіруйце свой погляд на вырашэнне складаных праблем: вы бліскуча з імі справіцеся. Усе пачынанні пятніцы стануць плённымі.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.34 | 19.52 | 13.18 |
| Віцебск — | 6.21 | 19.44 | 13.23 |
| Магілёў — | 6.24 | 19.42 | 13.18 |
| Гомель — | 6.22 | 19.37 | 13.15 |
| Гродна — | 6.49 | 20.07 | 13.18 |
| Брэст — | 6.52 | 20.05 | 13.13 |

### Месяц

*Маладзік у 11.49.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.*** *Лідзіі, Настассі, Васіля, Генадзя, Дзмітрыя.*
***К.*** *Вінцэнты, Ірэны, Вінцэнта, Юльяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




З юбілеем, з 90-годдзем, шчыра віншуем **ганаровага сябра шахматнага клуба «Гамбіт» Барыса Іванавіча Грышына!** Зычым яснага неба, свежага хлеба, добрых сяброў ды надзейных дактароў!

**З павагай да вас сябры-шахматысты.**



Даты | Падзеі | Людзі

### 5 КРАСАВІКА

У краіне

**1924** год — у Мінску адбыўся Усебеларускі з'езд работнікаў мастацтваў.

**1939** год — нарадзілася (г. Мінск) Тамара Андрэеўна Бірыч, беларускі вучоны ў галіне афтальмалогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. З 1975 года загадчык кафедры ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Аўтар навуковых прац па камп'ютарных метадах дыягностыкі і даследаванні ў афтальмалогіі, вывучэнні ўздзеяння малых доз радыяцыі на орган зроку, укараненні новых тэхналогій хірургічнага лячэння глаўкомы, катаракты, пашкоджанняў сятчаткі вока, афтальмапатalogіі ў дзяцей, якія пастаянна пражываюць на радыеактыўна забруджаных тэрыторыях. Распрацавала і ўкараніла перасадку рагавіцы, лазерныя метады лячэння хвароб вачэй. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памерла ў 2015 годзе.

**1944** год — нарадзілася (г. Масква) Таццяна Дзмітрыеўна Логінава, беларускі кінааператар. З 1971 года на Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». У 1991—2003 гадах арганізатар і дырэктар відэакінастудыі «Таццяна». Творчай манеры як аператара ўласцівая паэтычнасць пры перадачы атмасферы дзеяння. Зняла мастацкія фільмы «Антыквар», «Вянок санетаў», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Знак бяды», «Анастасія Слуцкая» і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1950** год — нарадзіўся Мікалай Іванавіч Казека, беларускі спартсмен і трэнер (скачкі на батуце, фрыстайл, лыжная акрабатыка), майстар спорту СССР па скачках на батуце, трэнер вышэйшай катэгорыі, заслужаны трэнер Беларусі. Чэмпіён і прызёр чэмпіянатаў СССР. Пасля заканчэння спартыўнай кар'еры Мікалай Казека спрабаваў сябе ў якасці трэнера па скачках у ваду. У 1986 годзе стаў старшым трэнерам зборнай БССР па фрыстайле, у дысцыпліне «лыжная акрабатыка». З 1993-га — нязменны галоўны трэнер нацыянальнай каманды Беларусі. Яго вучні заваявалі на зімовых Алімпійскіх гульнях сем медалёў рознай вартасці, у тым ліку чатыры залатыя.



**1990** год — Вярхоўны Савет БССР абвясціў 26 красавіка Днём чарнобыльскай трагедыі.

У свеце

**1932** год — прынята пастанова СНК СССР «Аб стане і развіцці проціпаветранай і проціхімічнай абароны СССР», якая вызначыла асновы арганізацыі проціпаветранай абароны краіны на многія гады наперад. На Наркамат па ваенных і марскіх справах ускладалася адказнасць па стварэнні сістэмы проціпаветранай абароны краіны і кіраванні службай ППА, а таксама па аб'яднанні дзейнасці ўсіх грамадзянскіх ведамстваў, устаноў і грамадскіх арганізацый у галіне мясцовай ППА.

**1952** год — у «Литературной газете» быў апублікаваны артыкул пад загалоўкам «Кібернетыка — «навука» цемрашалаў», у якой кібернетыку абвясцілі лжэнавукай.

## УСМІХНЕМСЯ

Адэса, раніца, бітком набіты аўтобус. У цэнтры салона сімпатычная дама гучна размаўляе па тэлефоне з сяброўкай:

— Вой, Розачка, ты не паверыш! Тут у мяне такое, такое!.. Уяўляеш, вяртаюся ўчора з работы, заглядваю ў спальню, а там мой Фіма ў ложку з нейкай гадаўкай! Я на дыбачках ціхенька кінулася на кухню, адкрыла шафку, узяла... Вой, Розачка, мне выходзіць трэба. Я ў пяць з працы паеду, пазваню, дараскажу.

І сапраўды, пасля пяці вечара дама садзіцца ў той жа аўтобус, а там усё тыя ж людзі. Перад самым адпраўленнем з прыпынку ў дзверы ўціскваецца мужчына і гучна ўсклікае:

— Уф, ледзь паспеў!

Потым пераводзіць позірк на даму і кажа:

— Ну, чаго ўтаропілася? Давай, тэлефануй Розачцы, людзі чакаюць!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1255.

Нумар падпісаны ў 19.30 4 красавіка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

5 красавіка 2019 г. № 14 (499)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Падрыхтоўка пачалася



VI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі прысвецяць моладзі. стар. 3

### Зусім нятанна...



Колькі каштуе знос старой хаты і добраўпарадкаванне ўчастка пасля гэтага. стар. 13

### Шлейф недарэчнасцяў



Чаму на асушаных землях не падтрымліваецца парадак. стар. 14

### Веладарожка і тысяча дрэў



Што яшчэ з'явілася ў Бараўлянах? стар. 16

### Ліпкая справа



Як школа ратавала парк у Дуброўне. стар. 16

# НІЧЫЙНАЯ НЕРУХОМАСЦЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Месца «сотага» заняў новы ўказ аб пустуючых і старых дамах. Што змянілася?

**У сувязі з наяўнасцю ў нашай краіне ў сельскай мясцовасці больш чым 30 тысяч старых дамоў і больш чым 10 тысяч пустуючых будынкаў дзеля ўдасканалення парадку ўключэння такіх дамоў у абарот, скарачэння выдаткаў пры іх продажы, змяншэння папяровага дакументаабароту летась з'явіўся Указ Прэзідэнта «Аб пустуючых і старых дамах» № 357.**

**Раней парадак работы з такімі дамамі рэгуляваў Указ № 100. За ўвесь час у цэлым па краіне было знесена больш за 47 тысяч дамоў, шэраг аб'ектаў знайшлі новых уласнікаў. Пасля прыняцця Указа № 357 прайшло крыху больш за паўгода. Асаблівасці новаўвядзенняў «МС» растлумачыла намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела прававога забеспячэння зямельных адносін, геадэзіі і картаграфіі юрыдычнага ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Антаніна ТОРБІНА.**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4—14-й стар. «МС».

ДОБРАЯ СПРАВА

# НА ШПАЦЫР — З БАЛКОНА

## Як у Гродне дэпутаты вырашаюць праблему безбар'ернага асяроддзя



**Сярод тых, каму пашанцавала, — Жанна і Васіль ГАПАСІ. Год таму яны звярнуліся да дэпутата сваёй выбарчай акругі з просьбай дапамагчы з устаноўкай пад'ёмніка. І вось нядаўна работы завяршыліся, і сям'я з абмежаванымі магчымасцямі атрымала выхад на вуліцу, што называецца, без праблем.**

### ТРЭБА ДАПАМАГАЦЬ

А вось раней праблем хапала. І пачаліся яны з таго моманту, як да дэпутата гарсавета Сяргея Каляды ад сям'і гродзенцаў прыйшоў электронны зварот, у якім была просьба пасадзейнічаць з устаноўкай пад'ёмніка. У лісце, між іншым, яны пісалі, што звярталіся ў гарвыканкам. Ім растлумачылі, што ўсталяваць пад'ёмнік у пад'ездзе немагчыма, бо няма прававой асновы і незразумела, як вырашаць пытанне з праектаваннем.

— Дэпутатам таксама могуць даць адпіску, — кажа Сяргей Каляда. — Але нам нельга апускаць рукі, трэба шукаць розныя магчымасці, нас для гэтага і выбіралі. Іншага шляху няма, трэба дапамагаць людзям.

стар. 15

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

# У новай эпосе адносін

## Беларускі саюз жанчын і Усекітайская федэрацыя жанчын падпішуць пагадненне аб супрацоўніцтве

**Рэгіянальнае ўзаемадзеянне, парламенцкі дыялог, эканоміка, інвестыцыі і гуманітарны вектар — партнёрства Кітая і Беларусі ў разнастайных кірунках абмяркоўвалі намеснік старшыні Савета Рэспублікі, кіраўнік Беларускага саюза жанчын Мар'яна ШЧОТКІНА і намеснік старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў, старшыня Усекітайскай федэрацыі жанчын Шэнь ЮЭЮЭ.**



БелТА.

Мар'яна Шчоткіна адзначыла, што з 2016 года, калі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Старшыня КНР Сі Цзіньпін падпісалі сумесную дэкларацыю аб устанаўленні адносін давернага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, пачалася новая эпоха адносін краін.

«Савет Рэспублікі — гэта палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, і мы бачым яўныя перспектывы ў развіцця прамых кантактаў паміж рэгіёнамі Беларусі і Кітая. Ёсць ужо вельмі добры вопыт рэгіянальнага супрацоўніцтва. Гэта перш за ўсё правінцыі Гуандун, Хунань, Цзянсу, горад Чунцын. Такое ўзаемадзеянне дае рэальную аснову для развіцця супрацоўніцтва. І ў гэтым працэсе нашы міжпарламенцкія групы дружбы гатовыя актывізаваць усе працэсы ўзаемадзеяння паміж рэгіёнамі», — адзначыла Мар'яна Шчоткіна.

Асаблівыя сяброўскія адносіны ўсталяваліся не толькі паміж краінамі, але, па словах віцэ-спікера Савета Рэспублікі, паміж ёю і кітайскай калегай Шэнь Юэюэ.

Паводле слоў намесніка старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў, двухбаковае партнёрства дынамічна развіваецца дзякуючы кіраўнікам краін і «зараз яны ўжо выйшлі на ўзровень узаемадавернага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства».

У аўторак кітайская дэлегацыя наведала Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Гэты праект — яскравы прыклад поўнамаштабнага двухбаковага супрацоўніцтва. Беларускі бок звярнуў увагу на неабходнасць прыцягнення ў індустрыяльны парк новых рэзідэнтаў і перадавых тэхналогій.

Дзве краіны гатовыя прыкладаць намаганні для рэалізацыі ўсіх дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты раней.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# У нас шмат агульнага

## Цэнтральна-Еўрапейская ініцыятыва падтрымлівае імкненне Беларусі да міжрэгіянальнага супрацоўніцтва

**Беларусь, як удзельніца самай старой у Еўропе рэгіянальнай арганізацыі, Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы, актыўна ўключаецца ў інтэграцыйны працэс і дэманструе, што з'яўляецца перспектыўным і надзейным партнёрам.**

У 2017 годзе Беларусь старшынствавала ў ЦЕІ і гэта была гістарычная падзея, адзначыла на сустрэчы з генеральным сакратаром арганізацыі Раберта Антаніёне **кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу ў Парламенцкім вымярэнні ЦЕІ Ірына СТАРАВОЙТАВА.** «Беларусь здольная прынесці новае ў развіццё рэгіёнаў. Асобую ролю ў развіцці ЦЕІ адыгрываюць парламенты: гэтае вымярэнне нараўне з бізнесам і ўзаемадзеяннем урадаў — самыя важныя «слупы» арганізацыі», — адзначыла яна.

Збліжэнне заканадаўстваў і ўкараненне найлепшых практык зробяць бізнес-клімат больш спрыяльным і ўмацуюць грамадзянскую супольнасць, таму дзяржавы — удзельнікі ЦЕІ павінны выпрацаваць кансалідаваныя рашэнні. Дзеля гэтага Беларусь гатовая прасоўваць розныя формы ўзаемадзеяння — і аднабаковыя, і шматбаковыя.

Вялікія перспектывы Ірына Старавойтава бачыць ва ўмацаванні міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння: «Патэнцыял рэгіёнаў напоўніцу яшчэ не задзейнічаны».

Згадзіўся з тым, што менавіта з рэгіёнаў пачынаецца поспех, і **генеральны сакратар ЦЕІ Раберта АНТАНІЁНЕ.** Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва падаецца найлепшым інструментам для знаёмства еўрапейскіх дзяржаў з беларускай сучаснай рэальнасцю.

Генсакратар высока адзначыў дзейнасць Беларусі ў якасці старшыні ЦЕІ ў 2017 годзе і таксама падкрэсліў, што парламент — сапраўды адна з «калон» ініцыятывы. Зараз распрацоўваюцца новыя формы супрацоўніцтва з Беларуссю і ўвогуле «Усходнім партнёрствам», а ніводная ідэя нежыццяздольная без адпаведнага заканадаўчага пацвярджэння.

У ЦЕІ вырашана наведаць усе 18 краін — удзельніц ініцыятывы і даведацца аб асаблівасцях, прапановах, імкненнях кожнай. У Беларусі Раберта Антаніёне бываў некалькі разоў і прызнаўся, што з часу яго першага візіту ў 2001 годзе тут вельмі шмат што змянілася да лепшага.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# АБ'ЯДНАЦЬ НАМАГАННІ

## Спікер верхней палаты парламента здзейсніў рабочую паездку ў Ганцавіцкі раён

**На мінулым тыдні старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны па Брэсцкай вобласці Міхаіл Мясніковіч наведаў некаторыя аб'екты раёна, ацаніў узровень гаспадарання на зямлі, развіццё прыватнага бізнесу, навядзенне парадку ў населеных пунктах. Разам з ім на аб'ектах пабывалі старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый Наркевіч, кіраўнік раёна Уладзімір Бялоў і старшыня раённага Савета дэпутатаў Юрый Шапель.**



Як паведамляе раённая газета «Савецкае Палессе», першым аб'ектам наведвання стала малочнатаварная ферма ААТ «Дубнякі». Аб становішчы спраў, планах і перспектывах гаспадаркі расказаў кіраўнік сельгаспрадпрыемства Сяргей Зянькові. Старшыня Савета Рэспублікі прайшоўся па ўсім комплексе, пачынаючы ад новых і заканчваючы старымі, але бюджэтна мадэрнізаванымі кароўнікамі. Міхаіл Уладзіміравіч звярнуў увагу прысутных на праблемы малочнай галіны, неабходнасць вытворчасці высакаякаснага малака, павышэння заработнай платы і важнасць стварэння дастойных умоў працы на вытворчасці.

— На вёсцы працаўнік фермы можа працаваць і атрымліваць годную заработную плату, — адзначыў ён. — Галоўнае — гаспадарыць з розумам, не ленавацца і разумець: калі будзе якасны прадукт, у дадзеным выпадку малако, будуць грошы, якія забяспечаць годнае жыццё і гаспадаркі, і ваша.

Наведаў Міхаіл Мясніковіч яшчэ малочнатаварную ферму ААТ «Крышылавічы», мясцовы лясгас і прыватнае прадпрыемства «ГанцавічыДрэўБуд». Старшыня Савета Рэспублікі выслухаў кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія не толькі расказвалі аб досведзе працы, але і падзяліліся планамі на перспектыву. На будаўнічай пляцоўцы ПМК-14 аграгарадка Агарэвічы Міхаіл Мясніковіч азнаёміўся з работамі па ўзвядзенні новага, сучаснага малочнатаварнага комплексу на 600 галоў.

Пасля гэтага спікер верхняй палаты парламента сустрэўся з прадстаўнікамі гаспадарчага актыву і звярнуў увагу прысутных на становішча спраў у сельскагаспадарчай галіне, работу камунальных, санітарных і дарожных службаў, узровень выканальніцкай і вытворчай дысцыпліны і іншыя пытанні.

Закрануў старшыня Савета Рэспублікі і тэму неабходнасці аказання ўсялякай падтрымкі малому бізнесу, у першую чаргу таму, які грунтуецца на мясцовых рэсурсах; стварэнні паўнавартаснай сістэмы перапрацоўкі сыравіны і адкрыцці новых рабочых месцаў. Была акцэнтавана ўвага на неабходнасці распрацоўкі перспектыўных планаў развіцця сельскагаспадарчай галіны і прамысловых прадпрыемстваў з канкрэтнымі прапановамі і эфектыўнымі мерапрыемствамі па іх рэалізацыі.

Напрыканцы Міхаіл Мясніковіч звярнуўся да прысутных:

— Перад кіраўніком раёна пастаўлены няпростыя задачы, вызначаны тэрміны іх выканання. Я лічу, што вы, першыя памочнікі, павінны не падводзіць кіраўніка, а ўсяляк яму дапамагаць. Мы, са свайго боку, абяцаем садзейнічанне ў тым, каб раён развіваўся больш дынамічна. Застаецца толькі вам аб'яднаць намаганні і працаваць, без затрымак і панукванняў.

# Диалог по местному самоуправлению будет продолжен

**Заседание Совета по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики на тему «Совершенствование законодательства Республики Беларусь, регулирующего вопросы местного самоуправления в целях устойчивого развития территорий» состоится в Минске 29—30 апреля. Планируется, что в нем примет участие делегация Конгресса местных и региональных властей Совета Европы во главе с председателем Конгресса Андерсом Кнапе.**

В мероприятии примут участие представители республиканских органов управления, Национальной академии наук Беларуси, председатели местных Советов депутатов, представители органов местного самоуправления.

По словам **председателя Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александра ПОПКОВА,** очередной обмен опытом и совместное обсуждение проблем местного самоуправления с представителями Конгресса местных и региональных властей Совета Европы состоятся в целях дальнейшего расширения сотрудничества с международными структурами и продвижения интересов нашей страны на европейском векторе.

Мероприятие пройдет в формате совместного заседания и продолжит конструктивный диалог, начатый на семинаре по вопросам местного самоуправления и на круглом столе, которые состоялись в прошлом году с участием представителей этой организации.

Среди вопросов, которые намечено обсудить на предстоящем заседании Совета по взаимодействию органов местного самоуправления с участием представителей Конгресса местных и региональных властей Совета Европы, — обзор законодательства Республики Беларусь, регулирующего деятельность местных Советов, закон «О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь».

Также планируется провести сравнительный анализ положений Европейской хартии местного самоуправления и нормативных правовых актов Республики Беларусь по этой тематике.

Намечено обсудить и Дорожную карту по совершенствованию законодательства, регулирующего деятельность органов местного самоуправления в Республике Беларусь, а также перспективы создания и организации работы ассоциаций местных Советов депутатов.

Ход подготовки предстоящего мероприятия обсуждался на очередном заседании Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению. На нем было отмечено, что сотрудничество с Конгрессом местных и региональных властей Совета Европы дает возможность Беларуси наладить контакты и взаимовыгодное сотрудничество на уровне территориально-административных единиц. Также у представителей местных органов власти вызывает немалый интерес изучение опыта работы своих зарубежных коллег в целях создания оптимальной модели местного самоуправления и развития регионов в условиях нашей страны.

**Наталья БИТЕЛЬ.**

# ФОРУМ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ ПРЫСВЕЦЯЦЬ МОЛАДЗІ

**Сумесныя маладзёжныя і культурна-гуманітарныя праекты абмяркуюць на VI Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які плануецца правесці ў Санкт-Пецярбургу 16—18 ліпеня. Праект праграмы мерапрыемства, тэматыка секцый і іншыя пытанні абмяркоўваліся ў Савеце Рэспублікі на пасяджэнні арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні форуму.**


sovrep.gov.by

Плануецца, што 17 ліпеня на форуме будуць працаваць шэсць секцый. Члены аргкамітэта на чале з яго старшынёй віцэ-спікерам Савета Рэспублікі Мар'янай Шчоткінай абмеркавалі тэматыку кожнай з іх. Удзельнікі сустрэчы выказалі свае ідэі і пажаданні, якія беларускі бок мог бы прапанаваць расійскаму на сумесным пасяджэнні арганізацыйных камітэтаў.

Адна з секцый будзе прысвечана рэалізацыі сумесных маладзёжных праектаў. Вынікам яе работы павінны стаць рэкамендацыі і прапановы па выкананні новых праектаў у розных сферах, у тым ліку ў эканоміцы і ІТ.

Падчас форуму плануецца абмеркаваць і культурна-гуманітарнае супрацоўніцтва. Як адзначалася на пасяджэнні аргкамітэта, за аснову мэтазгодна ўзяць праекты Саюзнай дзяржавы, рэгіянальныя праекты, узаемадзеянне паміж тэатрамі, бібліятэкамі і музеямі. Прапаноўвалася закрануць тэмы нацыянальнай ідэнтычнасці, базавых каштоўнасцяў. Вядучай тэмай, на думку беларускай часткі аргкамітэта, на гэтай секцыі (як, зрэшты, і на ўсіх шасці) павінна стаць узаемадзеянне моладзі дзвюх краін.

Мар'яна Шчоткіна нагадала, што Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на пленарным пасяджэнні V Форуму рэгіёнаў у Магілёве прапанаваў прысвяціць наступны форум разгляду пытанняў, звязаных з маладзёжнай тэматыкай, абмеркаваць рэальныя аспекты адукацыі, культуры, творчага развіцця, патрыятычнага выхавання і фарміравання здаровага ладу жыцця. Цікава, што ў Санкт-Пецярбургу пройдуць маладзёжны форум і пасяджэнне савета Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі.

Чакаецца, што на палях форуму адбудзецца сумеснае пасяджэнне нацыянальных дзелавых саветаў, збярэцца міжпарламенцкая камісія Савета Федэрацыі Расіі і Савета Рэспублікі Беларусь па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Перад пленарным пасяджэннем форуму, 18 ліпеня, па традыцыі адбудзецца сустрэча спікераў верхніх палат парламентаў дзвюх краін з кіраўнікамі дзяржорганаў абласцей Беларусі і суб'ектаў Расіі.

**Паводле БелТА.**

## Нічога нельга зрабіць без партнёрства

МЭТЫ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСІ

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па МУР Мар'яна Шчоткіна на мінулым тыдні прымала ўдзел у першым форуме імпакт-інвестыцый (інвестыцый сацыяльнага ўздзеяння).**

Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, Мар'яна Шчоткіна праінфармавала аб тым, якая работа праводзіцца ў Беларусі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Асаблівую ўвагу яна аддала сацыяльным аспектам, узаемадзеянню дзяржавы і бізнесу.

«Мы ведаем 17-ю мэту — партнёрства: нічога нельга зрабіць, калі не будзем разам. Дзяржава, бізнес і грамадства павінны працаваць у адным кірунку. Сацыяльныя праекты не даюць кароткатэрміновай аддачы ўкладзеных фінансаў, але яны з'яўляюцца неабходнай платформай для развіцця, павышэння іміджу. Для любой буйной кампаніі гэта іміджавыя інвестыцыі, падтрымка свайго брэнда», — падкрэсліла Мар'яна Шчоткіна.

Форум імпакт-інвестыцый стаў працягам першага Нацыянальнага форуму па ўстойлівым развіцці Беларусі, дзе таксама ўзнімалася тэма ўдзелу прадпрымальнікаў у сацыяльных праектах.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ДАВЕР ВЫБАРШЧЫКАЎ РАСЦЕ

**У мінулую суботу да старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў вобласці Уладзіміра Цярэнцьева падчас прамой ліній звярнуліся дванаццаць чалавек.**



Адзін з віцебскіх заяўнікаў расказаў пра тое, што ў двары на Маскоўскім праспекце замест таго, каб адрамантаваць альтанку, яе проста дэмантавалі. Уладзімір Цярэнцьеў паабяцаў, што тыя, хто гэта зрабіў, будуць абавязаныя ўсё аднавіць.

Жыхарка Віцебска паведаміла, што ў жыллёва-эксплуатацыйным участку, які абслугоўвае дом, параілі жыльцам сабраць грошы на рубероід. Будаўнічы матэрыял неабходны, каб адрамантаваць дах 10-павярховага дома на вуліцы Чкалава, які пасля кожнай зімы і падчас буйных ападкаў працякае. Гэты сігнал вельмі абурыў кіраўніка прадстаўнічай улады вобласці. Спасылкі на недахоп грошай тут наогул не «ў тэму». Гэта ўзорны прыклад раўнадушша таго, як нельга працаваць з людзьмі.

Быў званок нават пра праблемы з набыццём асфальтабетоннага грануляту: каля 40 тон неабходна для таго, каб прывесці дарогі ў нармальны стан на тэрыторыі садаводчага таварыства «Лучоса». Дарэчы, заяўніка Ігара Цеплякова Уладзімір Цярэнцьеў, як лідар «Белай Русі» вобласці, ведае. Старшыня абласнога Савета дэпутатаў адзначыў, што мужчына ўзначальвае абласную арганізацыю Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі. І сваім прыкладам паказвае, як можна дапамагаць уладзе ў пытаннях добраўпарадкавання. Разам з аднапартыйцамі яны навялі парадак каля памяшкання залы цяжкай атлетыкі. Цяпер клапоціцца аб дачніках.

Шматдзетная маці з Бешанковіцкага раёна агучыла праблему даўгабуда: кіраўнік фірмы не выканаў абяцанне, і жыллё не было своечасова ўведзена ў эксплуатацыю. Пры гэтым для разліку былі выкарыстаны бюджэтныя грошы — па лініі льготнага крэдытавання «Беларусбанка». Трэці год разбіраюцца ў сітуацыі праваахоўныя органы. Але і дом недабудаваны, і ніхто не пакараны. Старшыня аблсавета паабяцаў давесці інфармацыю да абласнога кіраўніцтва Следчага камітэта і пракуратуры.

Некалькі чалавек патэлефанавалі з Оршы і раёна. У прыватнасці, гараджанка прасіла дапамагчы з рамонтам дарогі каля жылых дамоў. А зборшчыка малака хвалявала праблема недахопу транспарту. Толькі адна яго грузавая машына можа выходзіць у рэйс, яшчэ некалькі нельга эксплуатаваць. А ўсё, паводле яго слоў, з-за праблем з выплатай грошай за растаможку. Сітуацыя няпростая, бо па законе ўсё, бадай, правільна. Але кожны сігнал і гэты канкрэтна будзе вывучаны.

Чарговы зварот з Оршы быў даволі нечаканым. Жанчына сказала, што хоча даглядаць маму, якая жыве ў глыбінцы, але ў адным маленькім доме з ёй жыць складана. Зразумела, ва ўзросце людзі бываюць капрызнымі, але кідаць роднага чалавека без клопату дачка не хоча. Побач ёсць дом, які судом прызнаны безгаспадарным. І яго павінны знесці, але жанчына гатовая яго набыць, каб прывесці ў парадак. Што можна зрабіць, каб і заканадаўства не парушыць, і дапамагчы ў добрай справе?

Жыхарка Наваполацка паскардзілася на тое, што цяжка дыхаць у раёне так званай прамзоны з-за таго, што аўто газуюць. Напэўна, прыйдзецца разбірацца экалагам. Але зноў жа — самая дробная праблема не застанецца па-за ўвагай і кантролем над яе вырашэннем.

Зямлячка навапалачанкі спадзяецца на працяг кантракта да яе выхаду на пенсію.

Уладзімір Цярэнцьеў паабяцаў давесці гэта да ведама тых, хто разбярэцца ў канкрэтнай сітуацыі.

Пасля прамой лініі ён сказаў, што большасць званкоў маглі быць адрасаваныя прадстаўнікам мясцовай улады. Але тое, што тэлефануюць кіраўніку прадстаўнічага органа ўлады вобласці, пацвярджае чарговы раз: давер выбаршчыкаў да дэпутатаў павышаецца.

Людзі спадзяюцца, што народныя абраннікі больш пільна і ўважліва выслухаюць і зробяць усё магчымае, каб дапамагчы. І нават калі заканадаўства не ўлічвае ўсе нюансы праблемы можна з часам паспрабаваць унесці адпаведныя змяненні. Гэта не забараняецца. Напрыклад, на ўзроўні парламента таксама вельмі плённа вывучаюць прапановы грамадзян. Законы не павінны адставаць ад часу. Але і людзі павінны разумець, што толькі дзякуючы іх звароту цуду не адбудзецца, калі праблема нетыповая і асаблівa патрабуе вялікіх грашовых выдаткаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Шляхі аздараўлення сельгаспрадпрыемстваў

разгледжаны на сесіі Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў

**Таксама падведзены вынікі мінулага года: летась на Гомельшчыне даходы перавысілі расходы амаль на дзевяць мільёнаў рублёў. Пры гэтым у поўным аб'ёме, а часам нават з перавышэннем запланаваных паказчыкаў, прафінансаваны расходы на дарожную і жыллёва-камунальную гаспадарку, адукацыю, сельскагаспадарчую вытворчасць.**

На сесіі Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў прыняты рашэнні, якія накіраваны на рэалізацыю Указа Прэзідэнта № 399. Размова — аб аздараўленні неплацежаздольных сельскагаспадарчых арганізацый, адзначыла **начальнік аддзела камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Кацярына ПАШКЕВІЧ:**

— Першае — гэта палажэнне аб парадку продажу прадпрыемства як маёмаснага комплексу або акцый сельгасарганізацый па конкурсе або шляхам правядзення аўкцыёну. Другое — палажэнне аб парадку здачы прадпрыемства ў арэнду. Трэцяе — аб парадку перадачы ў давернае кіраванне прадпрыемства як маёмаснага комплексу або акцый сельгасарганізацый. І чацвёртае — палажэнне аб перадачы паўнамоцтваў выканаўчага органа, гэта значыць кіраўніка. Пры паспяховай рэалізацыі бізнес-плана новы ўладальнік можа выкупіць такое сельгаспрадпрыемства.

Стаўка на крэатыўных людзей робіцца пры стварэнні маладзёжнага Савета пры абласным Савеце дэпутатаў. Такія ўтварэнні на Гомельшчыне ўжо існуюць пры Гомельскім гарадскім, Жлобінскім, Светлагорскім і Мазырскім раённых Саветах. Выбіраць маладзёжны Савет будуць у некалькі этапаў. Пачнуць з раённага ўзроўню. Галоўная ўмова — у кандыдата павінны быць ідэі, рэалізацыя якіх дазволіць зрабіць жыццё жыхароў рэгіёна лепшым, падкрэсліў **начальнік аддзела галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Дзяніс ДАВЫДАЎ:**

— У прадстаўнікоў маладзёжнага Савета ёсць права звяртацца ў органы дзяржаўнай улады са сваёй ініцыятывай і выходзіць з ёй на сесію абласнога Савета дэпутатаў або на прэзідыум абласнога Савета дэпутатаў, дзе будуць разгледжаны гэтыя ініцыятывы.

На апошняй сесіі абласнога Савета дэпутатаў таксама падведзены вынікі конкурсу сярод Саветаў усіх узроўняў і органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# НІЧЫЙНАЯ НЕРУХОМАСЦЬ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Указ уступае ў сілу часткамі

Праз тры месяцы пасля апублікавання Указ № 357 пачаў дзейнічаць у дачыненні да старых і пустуючых дамоў, што знаходзяцца ў сельскай мясцовасці, праз паўгода — у дачыненні да такіх дамоў, што месцяцца ў абласных цэнтрах і Мінску. А праз год указ канчаткова ўступае ў сілу, у часцы таго, што ўсе мясцовыя выканаўчыя камітэты павінны сфарміраваць рэестры пустуючых і старых дамоў і размясціць на сайце інфармацыю аб іх.

> Пустыя і старыя дамы прысутнічаюць практычна ва ўсіх раённых цэнтрах краіны. У Беларусі няма рэгіёна, дзе з сельскай мясцовасці людзі не з'язджалі б у гарады.

Да гэтага яны пакуль праводзяць практычную работу. Паводле нормаў указа, ствараюцца камісіі і пачынаецца абход тэрыторыі з мэтай фарміравання адпаведных рэестраў. Паколькі раней рэестры старых дамоў, размешчаных у сельскай мясцовасці, не вяліся, то цяпер гэтая работа толькі пачынаецца. Па пустых дамах у трохмесячны тэрмін мясцовыя ўлады перанеслі ў новыя рэестры інфармацыю аб такіх дамах, якая ўтрымлівалася ў рэгістрах уліку. Новыя аб'екты толькі цяпер яны пачынаюць знаходзіць, пасля абследавання ўсёй тэрыторыі.

Менавіта інфармацыю па пустых дамах мясцовыя спецыялісты размясцілі на сайтах раённых выканаўчых камітэтаў. Плюс па тых аб'ектах, якія раней былі ўключаныя ў гэтыя рэестры, яны правялі работу з улікам новых падыходаў Указа № 357. Дарэчы, дазваляецца сёння не марнаваць бюджэтныя сродкі для зносу гэтых аб'ектаў, а пры попыце на іх перадаваць азначаныя зямельныя ўчасткі толькі пры выкананні пэўных умоў. Сярод якіх — фінансаванне зносу будынкаў, у дачыненні да якіх прынята адпаведнае рашэнне, або непасрэдна знос аб'екта.

## Адзіныя рэкамендацыі для аднолькавага разумення

Сёння змяніўся падыход да вызначэння крытэрыяў пустуючых і старых дамоў у прынцыпе, адзначае Антаніна Торбіна. Тыя, якія раней падпадалі пад характарыстыкі пустуючых, сёння па ўказе ўжо могуць не быць такімі. Так, напрыклад, раней пустуючым дом прызнаваўся ў выпадку, калі на працягу трох гадоў людзі пражывалі ў кожным каляндарным годзе ў ім менш за месяц. Цяпер жа дом не прызнаюць пустуючым, калі там на працягу трох гадоў уласнік жыў хоць бы адзін дзень.

Новы ўказ таксама дазваляе выканкаму прымаць рашэнне аб выключэнні пэўных дамоў з рэестра, якія раней туды былі ўключаныя, але адпалі падставы іх лічыць прыналежнымі да адпаведнай катэгорыі.

Дарэчы, ёсць пастанова Савета Міністраў № 878 ад 6 снежня 2018 года, якой вызначаны парадак апублікавання звестак, парадак вядзення гэтых рэестраў. Формы рэестраў зацверджаныя, гэтак жа як і парадак арганізацыі аўкцыёнаў па продажы пустуючых дамоў і па продажы пустуючых дамоў без аўкцыёнаў. Сёння для работы выканкамам створана неабходная нарматыўная база. Цяпер неабходна непасрэдна выходзіць на месца. Праўда, часам узнікаюць пытанні ў практычнай дзейнасці, таму пры паступленні адпаведных запытаў Дзяржаўны камітэт па маёмасці тлумачыць іх дасканала. Хутчэй за ўсё, нейкія рэкамендацыі на пэўныя сітуацыі будуць разасланыя ва ўсе выканкамы, каб указ быў больш эфектыўна рэалізаваны на практыцы.

## Ёсць буйны праблемны рэгіён

— У прынцыпе па краіне сітуацыя з пустуючымі і старымі дамамі досыць розная, — дае сваю ацэнку Антаніна Сяргееўна. — Пэўная інфармацыя існуе толькі па пустых дамах. Канкрэтныя лічбы мы будзем мець толькі праз год пасля прыняцця ўказа — сёлета ў верасні. Сярод рэгіёнаў можна вылучыць Гомельскую вобласць, дзе такіх аб'ектаў сапраўды шмат. Калі ў 2017 годзе ў абласцях было ўключана ў рэестр па пустых дамах у сярэднім па 300—400 аб'ектаў, то на Гомельшчыне гэтых будынкаў было больш за тысячу. З гэтай мясцовасці людзі ў свой час масава з'язджалі з прычыны трагедыі на ЧАЭС. Жылая нерухомасць доўгі час пуставала. Многае руйнавалася.

Пустыя і старыя дамы прысутнічаюць практычна ва ўсіх раённых цэнтрах краіны. У Беларусі няма рэгіёна, дзе з сельскай мясцовасці людзі не з'язджалі б у гарады.

## На заметку — кожныя паўгода

Зараз, згодна з указам, камісія павінна абследаваць усю сваю тэрыторыю, за якую яна нясе адказнасць у фарміраванні рэестра, кожныя паўгода. Акрамя таго, спецыялісты будуць візуальна аглядаць і ацэньваць на адпаведнасць гэтым крытэрыям (якім лічыць: старым альбо пустуючым будынкам), прадстаўнікі камісій стануць апытваць людзей, якія могуць мець інфармацыю аб уласніках. Калі ў гэтыя шэсць месяцаў пацвярджаецца, што ніхто сюды не прыязджаў, не пражываў у жылым доме, то гэты аб'ект аўтаматычна стане «на заметку». Потым, кожныя паўгода гэтаму аб'екту будзе аддадзена самая пільная ўвага. Калі будынак у аварыйным стане — тады трэба на працягу года за ім назіраць (каб людзі там не пражывалі), пасля чаго дом можа быць прызнаны старым. Каб прызнаць хату пустуючай — трэба быць упэўненым, што там ніхто не жыве на працягу трох гадоў.

## Калі што, то і ўласнік не патрэбны

З уступленнем у дзеянне новага дакумента ўсё стала больш зразумела для выканкамаў. Раней, каб назваць жылы дом старым і далей з ім працаваць, неабходна было прызнаць яго непрыдатным для жылля. А гэтая адміністрацыйная працэдура мела на ўвазе абавязковы асабісты ўдзел уласніка гэтага дома, патрэбна была яго згода. А перад тым неабходна было спачатку яго знайсці. Усё гэта разам было практычна немагчыма зрабіць. Тады выканкамы ішлі па працэдуры пустуючых дамоў. Фактычна дом падпадаў пад катэгорыю старога, а знаходзіўся ў рэестры пустуючага, таму што працэдуру папярэдняга прызнання яго непрыдатным для пражывання без уласніка прайсці было немагчыма. Таму выканкамы, спрабуючы навесці парадак на зямлі, выкарыстоўвалі ўсе механізмы папярэдняга «сотага» ўказа. Цяпер гэтыя паняцці выразна падзялілі. Для таго каб дом прызналі старым, ён павінен знаходзіцца ў аварыйным стане або пагражаць абвалам.

> Для таго каб дом прызналі старым, ён павінен знаходзіцца ў аварыйным стане або пагражаць абвалам.

Цяпер урэгуляваныя пытанні, калі ўласніка няма, ці ён не ідзе на кантакт. Тут дзейнічае схема, па аналогіі з пустуючымі дамамі. У гэтым выпадку таксама будуць працаваць з такімі аб'ектамі — размяшчаць інфармацыю на сайце, займацца пошукам гэтага чалавека, але... Калі яго не знойдуць і па заканчэнні года пасля апублікавання інфармацыі ў СМІ ён не аб'явіцца, не будуць прынятыя меры для аднаўлення жылога дома альбо ніхто не звернецца па атрыманне дазволу на яго рэканструкцыю, то згодна з Указам № 357 будзе лічыцца, што ўласнік такога дома адмовіўся ад права ўласнасці на гэтую нерухомасць. А ў дачыненні да гэтага старога дома будзе прымяняцца адпаведная працэдура. Ён па рашэнні суда будзе паступаць у камунальную ўласнасць, без усялякай выплаты кампенсацыі ўласніку. Раней гэтае пытанне не было ўрэгулявана.

Антаніна Торбіна нагадвае: акрамя Указа № 357 у заканадаўстве ёсць іншыя прававыя механізмы, што дазваляюць навесці парадак на зямлі. «Так, напрыклад, выканкамы ставілі на ўлік нават тыя аб'екты, ад якіх фактычна застаўся толькі падмурак. А яго абвяшчалі пустуючым і ішлі ў суд, каб прызнаць яго безгаспадарным. Сёння мы тлумачым гэтую сітуацыю такім чынам.

Калі фактычна дом загінуў, то гэтая гібель цягне за сабой спыненне правоў на яго. Тобок, у такой сітуацыі выканкамам не трэба праходзіць усю працэдуру, каб спыніць у Адзіным дзяржаўным рэгістры нерухомай маёмасці і правоў на яе і здзелак з ёю запіс аб гэтым аб'екце. Сёння ў нас ёсць механізм, які дазваляе скласці акт гібелі на гэты аб'ект і зарэгістраваць спыненне яго існавання і правоў на яго па заяве мясцовага выканаўчага камітэта, не чакаючы заявы ад уласніка і не звяртаючыся ў суд.

Але ў такой сітуацыі ёсць пэўныя нюансы, і правы ўласніка жылога дома будуць у любым выпадку абароненыя. Так, калі дом загінуў у выніку пажару ці іншага стыхійнага бедства, то Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб зямлі ўласніку даецца год з магчымасцю падоўжыць яго да двух гадоў на аднаўленне гэтага дома і толькі пасля заканчэння гэтага тэрміну, калі ім не робяцца захады для аднаўлення хаты, можна будзе весці гаворку аб канфіскацыі зямельнага ўчастка, на якім яна размешчана, і спыненні існавання пабудовы і правоў на яе. Пры гэтым у любым выпадку аб падачы мясцовым выканаўчым камітэтам у арганізацыю па дзяржаўнай рэгістрацыі заявы аб спыненні існавання такога жылога дома і правоў на яго, уласніку ў абавязковым парадку паведаміць рэгістратар. Пры нязгодзе ўласніка ён мае права звярнуцца ў суд. Да вырашэння судом адпаведнага пытання, спыненне існавання такога дома і правоў на яго арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі ажыццяўляцца не будзе.

## І ў гарадах ёсць дамы, дзе ніхто не жыве

Па вялікіх гарадах указ уступіў у сілу толькі ў сакавіку. На цяперашнім этапе там фарміруюцца спецыяльныя камісіі. Далей яны пойдуць абследаваць тэрыторыю, каб выявіць праблемныя дамы. Першапачаткова гэты праект быў разлічаны на старыя і пустуючыя дамы ў сельскай мясцовасці. Але такія аб'екты існуюць і ў гарадах. Што з імі рабіць? Атрымлівалася, што механізма няма. Дакладней — не было.

Аб якой колькасці «нічыйнай» жылой нерухомасці можа ісці гаворка ў гарадах, казаць пакуль складана. Гэта залежыць ад шматлікіх фактараў, эканамічнага дабрабыту, высокай адказнасці ды свядомасці людзей. Адно можна сказаць з упэўненасцю на 100 %, пустыя (ды і старыя таксама) дамы існуюць у прыватным сектары практычна ва ўсіх буйных гарадах краіны.

У гарадах, дзе сапраўды нерухомасць каштуе вялікіх грошай, дзе зямельны ўчастак пад будынкамі мае павышаную каштоўнасць, хутчэй за ўсё старых і пустуючых дамоў будзе па мінімуме. Напрыклад, у сталіцы і Брэсце попыт на нерухомасць вельмі вялікі, да таго ж не хапае зямельных участкаў. Таму там любыя аб'екты, якія могуць быць зарэгістраваныя і прададзеныя, будуць запатрабаваныя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

На хвалі

# ТАЛЕНТЫ ІДУЦЬ НА РЭКОРД

**На рэспубліканскі творчы радыёконкурс «Маладыя таленты Беларусі», зладжаны Першым нацыянальным каналам Беларускага радыё ўжо восьмы раз, паступіла 410 заявак. Арганізатары адзначаюць, што колькасць удзельнікаў сёлета рэкордная.**




— Як заўсёды, самая шматлікая намінацыя — эстрадны вакал, — удакладняе **аўтар і кіраўнік праекта Таццяна ЯКУШАВА,** — аднак цешыць тое, што ў гэтым годзе ўсяго на 20 заявак менш і ў інструментальнай намінацыі. Гэта добрая тэндэнцыя, якая сведчыць пра запатрабаванасць нашага конкурсу сярод прадстаўнікоў акадэмічных жанраў, пра тое, што нам давяраюць.

Творчая планка конкурсу застаецца стабільна высокай. Так, у свой час лаўрэатамі і прызёрамі «Маладых талентаў Беларусі» станавіліся Алена Ланская, Юрый Дземідовіч, Лідзія Заблоцкая, Аляксандр Мінёнак, Хелена Мерааі, Кірыл Ермакоў, Зінаіда Купрыяновіч і многія іншыя маладыя выканаўцы, чые імёны сёння ўжо на слыху ў шырокай аўдыторыі. А па выніках леташняга спаборніцтва, у якім удзельнічала больш за 330 таленавітых дзяцей, падлеткаў і маладых людзей з усіх рэгіёнаў краіны, 20 лаўрэатаў атрымалі стыпендыі і прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

Калі адлюстроўваць ход конкурсу стрыманай мовай лічбаў, то сёлета ў намінацыі «Эстрадны вакал» арганізатары атрымалі заяўкі ад 157 салістаў і 37 ансамбляў, «Інструментальная музыка» сабрала заяўкі 139 салістаў і 30 калектываў, у намінацыі «Спадчына» возьмуць удзел 27 сольных артыстаў і 10 творчых суполак. У найбліжэйшы час усе дасланыя запісы праслухае прафесійнае журы на чале з народным артыстам Беларусі кампазітарам Леанідам Захлеўным. З 16 красавіка да канца месяца адбудуцца другі і трэці туры творчага спаборніцтва — жывыя праслухоўванні ўдзельнікаў у сталічным Доме радыё. Пераможцаў 8-га рэспубліканскага конкурсу «Маладыя таленты Беларусі» абвесцяць і ўзнагародзяць 2 мая падчас міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 66

Свае новыя задачы прапануе нам Віктар Жук з Брэста. Вось першая з іх ***(гл. дыяграму).***



Белыя: Kpb5, Фh6, Cg7, пп.b2, e5, f2 (6).

Чорныя: Kpd5, пп.b3, d6, f3 (4).

Мат у 3 хады.

**№ 2.**

**Белыя:** Kpe4, Фa4, Cb1, пe3 (4).

**Чорныя:** Kpc3 (1).

Мат у 3 хады.

Калі белага слана пераставіць на e3, атрымліваецца задача-блізня.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі (газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Магілёве прайшла першая ліга (адборачны турнір) чэмпіянатаў Беларусі. У мужчын змагаліся 25 шахматыстаў (у тым ліку адзін гросмайстар, два міжнародныя майстры і два майстры ФІДЭ), а месцы з першага па шостае ў выніковай табліцы занялі адпаведна міжнародны майстар Віталь Мерыбанаў, майстар ФІДЭ Аляксей Тэрзі, гросмайстар Віталь Цецераў, міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі, Арцём Стрыбук і майстар ФІДЭ Дзяніс Лазавік. Сярод 14 шахматыстак у першую шасцёрку трапілі Яна Ільючык, Ксенія Зелянцова, міжнародны майстар Таццяна Каспарава, Ганна Сташыс, Вера Пракапук і Аляксандра Тарасенка.

На Мемарыяле Г. Агзамава ў Ташкенце (73 удзельнікі) Аляксей Фёдараў заняў першае месца, Валерый Казакоўскі — дзявятае.

Фінішавала шахматная ўніверсіяда, у якой бралі ўдзел зборныя 23 беларускіх ВНУ. Прызавую тройку склалі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры. На першай дошцы ўсе сем партый выйграў Мікіта Свідзерскі.

У спартакіядзе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях першыя два месцы занялі вядомыя маладыя майстры Віталь Мерыбанаў і Валянцін Ежаль.

Дзевяць беларускіх шахматыстаў — міжнародныя гросмайстры Уладзіслаў Кавалёў, Аляксей Аляксандраў, Сяргей і Андрэй Жыгалкі, Сяргей Азараў, Кірыл Ступак, міжнародныя майстры Міхаіл Нікіценка, Вячаслаў Зарубіцкі і Вольга Бадэлька — прынялі ўдзел у чэмпіянаце Еўропы ў Македоніі. Падрабязней пра гэты турнір — у наступным выпуску.

* * *

Мы ўжо расказвалі пра турнір «Аэрафлот» у Маскве з удзелам беларускіх гросмайстраў. А вось яшчэ адна з пераможных партый.

Кірыл Ступак — Мітал Адзітыя (Індыя). 1.d4 d5 2.Kf3 Kf6 3.c4 c6 4.Kc3 e6 5.Cg5 dc 6.e4 b5 7.e5 h6 8.Ch4 g5 9.K:g5 hg 10.C:g5 Kbd7 11.g3 Cb7 12.Cg2 Фb6 13.ef c5 14.d5 0-0-0 15.0-0 b4 16.Ka4 Фa6 17.a3 C:d5 18.ab Ke5 19.Фe2 Фc6 20.f3 Kd3 21.b5 Фd7 22.Kc3 Ch6 23.f4 C:g5 24.fg Kpb8 25.h4 C:g2 26.Kp:g2 e5 27.Фe4 Kf4+ 28.Kpg1 Фd4+ 29.Ф:d4 cd 30.Ke4 Ke2+ 31.Kpg2 d3 32.Лa4 Лd4 33.Kc3 Лg4 34.K:e2 de 35.Лe1 Лh:h4 36.Л:e2 Л:g5 37.Л:e5 Л:e5 38.gh Л:b5 39.Л:c4 Л:b2+ 40.Kpg3 Лb6 41.Лf4 Kpc7 42.Kpg4 Kpd7 43.Kpg5 Kpe8 44.Лc4 Лb1 45.h5 Лg1+ 46.Kph6 a5 47.Лc5 Kpd7 48.Л:a5 Kpe6 49.Лg5 Лf1 50.Kpg7 Л:f6 51.h6 Лf1 52.h7 Лh1 53.h8Ф Л:h8 54.Kp:h8 Kpf6 55.Лg1 Kpe5 56.Лe1+, 1:0.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Фa1. Першымі правільна адказалі Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Сяргей Цыльпук, Васіль Жуковіч, Васіль Канановіч.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

## СІНЮЮ ці ЧЫРВОНУЮ?

### 20 гадоў таму на экраны выйшаў фільм «Матрыца»



Зялёныя коды, якія плынямі бягуць у застаўцы фільма і ў эпізодах, — гэта лічбы, лацінскія літары ў адлюстраваным напісанні, а таксама японскія іерогліфы, якія дызайнер узяў... з кнігі рэцэптаў сушы.

У тыя слаўныя часы, калі галівудскія рэжысёры сёстры Вачоўскі яшчэ былі братамі, а Дзень інтэрнэту як асобнае свята не існаваў у прыродзе, нераўнадушныя людзі ўжо задумваліся пра тое, чым абернецца ў будучыні пранікненне ва ўсе сферы жыцця камп'ютарных тэхналогій. Адной з такіх фантастычна-філасофскіх разваг стаў фільм «Матрыца», які мо не выпадае назваць культавым з прычыны ўзросту, але ён акумуляваў у сабе цэлы шэраг філасофскіх, рэлігійных і мастацкіх кірункаў, дакладна перавярнуў свядомасць цэлага пакалення і стаў узорам, на які арыентаваліся аўтары мноства іншых кінастужак, мультфільмаў і коміксаў. Не кажучы ўжо пра чатыры атрыманыя «Оскары», дзве прэміі «Сатурн» і дзве ўзнагароды ад Брытанскай кінаакадэміі.



Акуляры для акцёраў падбіралі індывідуальна, прычым у конкурсе ўдзельнічалі тры кампаніі-вытворцы.

...У вялікім горадзе жыў даволі звычайны, хоць і паспяховы, праграміст Томас Андэрсан, днём працаваў у вялікай карпарацыі, а ноччу гарэзаваў у сеціве як хакер Нэа. Пакуль аднойчы не атрымаў на асабісты камп'ютар дзіўны наказ ісці за белым трусікам і не сустрэўся з ворагам існуючай сістэмы Морфеусам, які прапануе на выбар дзве пілюлі: сінюю — каб забыць пра ўсё і прачнуцца ў звыклым свеце, альбо чырвоную — каб дазнацца, што насамрэч Зямля даўно знаходзіцца пад уладай суперкамп'ютараў, гарады ляжаць у цемры і руінах, а людзі вырошчваюцца ў колбах як сродак энергіі для машын. У выніку Нэа аказваецца асаблівым — Абраным, узначальвае партызанскую барацьбу людзей з машынамі — і, увяўце сабе, перамагае, праўда, у канцы трылогіі.

Усё гэта прыхільнікі фільма добра помняць. Але нямногія ведаюць, што яшчэ на этапе кастынгу сцэнарый быў высланы Тому Крузу, Леанарда Дзі Капрыа, Уілу Сміту, Нікаласу Кейджу, і ўсе яны адмовіліся ад ролі Нэа. Таксама не пагадзіліся сыграць галоўны дуэт «агенты Малдар і Скалі» — Дэвід Духоўны і Джыліян Андэрсан. А вось змрочнае абаянне Кіяну Рыўза і Кэры-Эн Мос аказалася менавіта тым, што шукалі рэжысёры. Ролю агента Сміта па задуме мусіў сыграць Жан Рэно, але той адмовіўся пераязджаць у Аўстралію, і тады на пробы запрасілі Х'юга Уівінга.

Дарэчы, сам сцэнарый браты Вачоўскі выношвалі больш за пяць з паловай гадоў і перабралі 14 (!) варыянтаў развіцця сюжэта.

Кінакампанія Warner Brothers выдзеліла на карціну толькі 10 мільёнаў долараў з 80, якія прасілі рэжысёры, — і тыя на сваю рызыку патрацілі ўсю суму, каб зняць толькі адну сцэну — першыя 10 хвілін фільма. Вынік так уразіў босаў, што яны пагадзіліся на далейшае фінансаванне. Пры гэтым з-за дарагіх візуальных эфектаў давялося эканоміць на касцюмах герояў — так, вопратку Трыніці пашылі з таннага вінілу, а паліто Нэа — з самай простай паўшарсцяной тканіны.

Каб падрыхтавацца да сцэны прабуджэння ў капсуле, Кіяну Рыўз скінуў 15 фунтаў і пагаліў усё цела, нават бровы.

На здымкі перастрэлкі ў холе карпарацыі спатрэбілася амаль 10 дзён: калоны і сцэны былі начыненыя піратэхнікай, якая знішчала дэкарацыі, і пасля кожнага дубля ўсё аднаўлялі наноў.



Да сярэдзіны 2002 года эфект «спынёнай кулі», які так відовішчна паказала «Матрыца», быў выкарыстаны больш чым у дваццаці фільмах.

У сцэне «Жанчына ў чырвоным» былі задзейнічаны дзясяткі пар блізнят, якія паказвалі ілюзію бясконцых паўтораў праграмы Матрыцы. Але візітоўкай карціны стаў эфект «час кулі» — практычна поўнае спыненне часу ў кадры, калі камера працягвае рухацца. Кошт спецэфектаў у выніку склаў 20 % ад усяго бюджэту карціны.

❍ Сказана!

**«Запомні, Нэа, лыжкі не існуе...»**

**«Я не казаў, што будзе лёгка. Я толькі абяцаў, што гэта будзе праўда».**

**«Ласкава запрашаем у рэальны свет».**

**«Чалавецтва — гэта хвароба, ракавая пухліна планеты. А мы — лекі».**

**«Я ведаю кунг-фу».**

**«Галоўнае, не вер усякай лухце наконт фатуму. Ты гаспадар свайго жыцця».**

**«Калі б ты не мог прачнуцца, як бы ты даведаўся, што сон, а што рэальнасць?»**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 21.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.05** «Зона Х» (16+).
**9.10** «Галоўны эфір».
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Вясной расцвітае каханне» (16+).**
**12.35, 13.05, 14.30, 15.25 Меладрама «Жонка напракат» (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Нашы» (6+).
**22.10 Серыял «След» (16+).**
**23.45** «Арэна».
**0.45** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.35** «Тэлебарометр».
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Даравацъ» (16+).**
**10.20** «Капейка ў капейку» (12+).
**11.00** «Свет навыварат. Непал» (16+).
**11.55** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).
**12.40** Анімацыйны фільм «Гісторыя цацак. Вялікія ўцёкі» (0+).
**14.20 Камедыя «Голы пісталет 2 1/2: пах страху» (12+).**
**15.50 Баявік «Джэк Раян: тэорыя хаосу» (12+).**
**17.40** «Веру — не веру» (16+).
**19.15** «Суперлато».
**21.10, 22.05** «Тата папаў» (16+).
**22.00** КЕНО.
**22.50** «Хадзі сюды і танцуй».
**22.55 Серыял «Жаночы доктар» (16+).**
**23.45** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40, 12.25** «Беларуская кухня». Зуцы (катлеты з грыбоў).
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.30** «Гэты дзень».
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25, 16.45 «Сяржант міліцыі». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).**
**10.35** «Навукаманія» (6+).
**11.05** «Архітэктура Беларусі».
**11.20, 21.05** «Апошні дзень». Надзея Румянцава (12+).
**12.55** «Беларусь як песня». Анатоль Падгайскі.
**13.25** «Наперад у мінулае».
**13.55, 19.20** «Вызваленне». «Вісла-Одэрская аперацыя. Завяршэнне» (12+).
**14.20, 21.40 «Атрад спецыяльнага прызначэння». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).**
**15.30** «Люблю і памятаю». Народны артыст СССР Данатас Баніёніс.
**16.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**17.50** «Легенды музыкі». Ігар Талькоў (12+).
**18.20** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-2007».
**19.45** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Уладзімір Новак.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50 «Сумненне». Маст. фільм (12+).**

## Беларусь 5

**6.40** Тэніс. WTA. Мантэрэй. Фінал.
**8.40** Вынікі тыдня.
**9.25** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал.
**11.25** Вялікі спорт.
**12.10** Тэніс. WTA. Чарльстан. Фінал.
**14.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Арсенал».
**16.10** Гульні.by.
**16.30** Футбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Відэачасопіс.
**17.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Батумі.
**18.45** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Вест Хэм». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** «Нашы навіны».
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.10 Серыял «Доўгі шлях дадому» (16+).**
**12.05** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Каралева гульні» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.25** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10** Ток-шоу «Наша жыццё».
**22.10 Серыял «Падкідыш» (16+).**
**0.00 Серыял «Краіна 03» (16+).**
**1.10** «Нашы навіны. Галоўнае за дзень».

## СТБ

**5.30** «Вялікі горад».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.05** «Вадзіць па-руску» (16+).
**9.25** «Тыдзень».
**10.40, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**12.40, 23.45** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 0.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.40** «Вадзіць па-руску» (16+).
**15.10, 16.50 «Метад Фрэйда-2». Серыял (16+).**
**19.55, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30 «Водбліскі». Серыял (16+).**
**22.10** «Глядзець усім!» (16+)
**1.15** «Мінтранс» (16+).
**1.50** «Самая карысная праграма» (16+).

## МІР

**6.00, 10.10, 5.20 Серыял «Воўчае сонца» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**12.30, 1.00** «Такому мама не навучыць» (12+).
**13.15, 3.00** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 1.30** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 2.15** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 19.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.40 Серыял «Мар'ін гай» (16+).**
**23.35, 0.10** Дак. фільм «Адкрыты космас». 1-я серыя (0+).
**3.50 Маст. фільм «Цырк» (0+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.45** «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35, 14.30** Серыял «Жанчыны на грані» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.35** «Лёс чалавека» (12+).
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Выпрабаванне» (12+).**
**22.30, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**0.30** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Спецыяльны рэпартаж» (12+).
**6.30** «Гарады Беларусі» (6+).
**7.10** «Цуд тэхнікі» (12+).
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.40** «За гранню» (16+).
**10.20** «Чакай мяне» (12+).
**11.05** «Крутая гісторыя» (12+).
**11.55, 23.10** «Пракурорская праверка» (16+).
**13.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**14.00, 16.30 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**17.05** «ДНК» (16+).
**18.10** «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).
**19.40** «Сёння. Галоўнае».
**19.55 Серыял «Вакальна-крымінальны ансамбль» (16+).**
**22.45** «НЗ.by».

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.05, 21.05, 0.05** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** М/с «Чып і Дэйл».
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Меладрама «Паўночнае сонца» (16+).**
**9.00** Дак. серыял «Радавыя праклёны. Дынастыя Ан'елі» (12+).
**9.45, 19.10 Серыял «Кандзіс Рэнуар» (16+).**
**10.40 Баявік «Джэк Рычэр (16+).**
**12.50, 20.05 Серыял «Смяротная зброя» (16+).**
**13.35 Фантастыка «Людзі Х».**
**16.30** Дак. фільм «Сібір».
**17.25 Серыял «Пуаро Агаты Крысці» (12+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Фантастыка «Інтэрстэлар» (12+).**

## ВТБ

**6.05, 4.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**6.50, 5.00** «Лаві момант» (16+).
**7.25, 3.05** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**8.20, 2.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**9.15** М/ф «Марын і яго сябры» (0+).
**9.45** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**10.05, 19.10, 22.35** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.40** «Наш рамонт» (16+).
**11.30** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.20** «Проста кухня» (16+).
**13.00** «Рогаў. Студыя 24» (16+).
**14.00, 23.15** Скетч-шоу «Нерэальная гісторыя» (12+).
**15.25** Фантастыка «Хэнкок» (16+).



**17.15** Анімацыйны фільм «Дазор джунгляў» (6+).
**20.40** Баявік «Вялікі ўраўняльнік» (16+).
**0.40** «Хачу верыць!» (16+)

## Культура

**6.30** «Храбры кравец», «Чарадзейны пярсцёнак», «Архангельская навелы». М/ф.
**7.50** «Сіта і Рама». Серыял.
**9.25** «Звычайны канцэрт».
**9.55** «Мы — грамацеі!»
**10.35** «Агні вялікага горада». Маст. фільм (0+).
**12.00** «Навуковы стэндап».
**12.45** «Лісты з правінцыі». Усевалажск (Ленінградская вобласць).
**13.15, 0.50** «Дыялогі пра жывёл. Лора Парк. Тэнэрыфэ».
**13.55** Невядомы «Масфільм». «Заўчасны» чалавек». Маст. фільм.
**15.50** «Больш, чым каханне». Яфім Капелян і Людміла Макарава.
**16.30** «Карціна свету».
**17.10** «Пешшу...» Масква Савы Мамантава.
**17.35** Да 65-годдзя Валерыя Гаркаліна. «Блізкае кола».
**18.35** «Рамантыка рамансa». Юрыю Сіланцьеву прысвячаецца...
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Усім — дзякуй!» Маст. фільм (0+).
**21.40** «Белая студыя».
**22.25** Спектаклі тэатра «Гелікон-опера». П. І. Чайкоўскі. «Мазепа».
**1.35** «Крыўда», «Аркадзія». М/ф для дарослых.
**2.00** — Прафілактыка на тэлеканале.

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1985. 1-я частка. 2010 год (12+).
**7.00, 8.35, 9.45, 11.00, 17.25, 18.55, 20.00, 23.30, 0.55, 2.35, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.20** Маст. фільм «Пакуль не выпаў снег...» (16+).
**9.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**12.00** Маст. фільм «Нябесны ціхаход» (12+).
**13.15** Фільм-канцэрт «Мініяцюры». 1975 год (12+).
**13.50** «Мы Вас любім!» Канцэрт гурта «Воскресение». 1994 год (12+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** «Вакол смеху» з Аляксандрам Івановым. 1986 год (12+).
**18.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**19.10** «Зямля — Паветра». Пётр Мамонаў. 2003 год (16+).
**20.30** Фільм-спектакль «Рэвізор». 1982 год (12+).
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». «Звукі Му». 1-я частка. 2006 год (16+).
**1.20** Маст. фільм «Белы шаман». 3-я серыя (16+).

## EuroSport 1

**1.30, 7.30, 19.00** Плаванне. Nordic Swim Tour.
**2.30, 6.00** Веласпорт. «Тур Краіны Баскаў».
**4.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**9.00** Лёгкая атлетыка. Марафон.
**12.00, 22.00** Веласпорт. Парыж — Рубэ.
**18.30, 21.00, 23.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**20.35** Аўтагонкі. Формула Е.

## Кінакамедыя

**0.00** Бандыткі (16+).
**1.40** Наша Russia. Яйкі лёсу (16+).
**3.15** З 13 у 30 (12+).
**5.00** Прыкінься маім мужам (16+).
**6.55** Удалы выпадак (16+).
**8.45** Дзень выбараў па-французску (16+).
**10.30** Дом з паранармальнымі з'явамі (16+).
**12.10** Дом з паранармальнымі з'явамі-2 (18+).
**13.45** 1+1 (16+).
**16.00** Выгляд зверху лепш (12+).
**17.40** Старскі і Хатч (12+).




**19.30** Ну, прывітанне, Аксана Сакалова! (16+).
**21.30** Кахае не кахае (16+).
**23.05** Выкідала (18+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**9.30** «Заўтра сёння» (12+).
**10.00** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**10.50** «Глядзі сам» (12+).
**11.10, 1.50** «Маёр паліцыі». Серыя (16+).



**14.50, 4.50** «Ён і яна» (16+).
**16.15** «Талаш». Драма (12+).
**20.30** «Без падману» (16+).
**21.25** «Асцярожна, махляры!» (16+)
**22.00** «Блэйд». Фантастыка (12+).
**0.20** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).

## ТБ1000

**6.10, 15.20** Бэтмен: пачатак (12+).
**9.00** Мой хлопец — псіх (16+).
**11.30** Д'ябал і Дэніэл Уэбстэр (16+).
**13.35** Разня (16+).
**18.10** Інтуіцыя (12+).
**20.10** Бібліятэкар: у пошуках кап'я Лёсу (16+).
**22.05** Бандыты (16+).
**0.30** Неймавернае (18+).
**2.25** Мабільнік (18+).
**4.10** Прабач, хачу на табе ажаніцца (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Уцячы, дагнаць, закахацца (12+).
**8.10** Чэмпіёны (6+).
**10.15** Чорная вада (16+).
**12.30** Вязень замка Іф. Абат Фарыя. 1-я серыя (12+).
**14.00** Адліга. 1—4-я серыі (16+).
**18.25** Любоў-маркоў-2 (12+).
**20.20** Чэмпіёны: хутчэй, вышэй, мацней (6+).
**22.25** Грэцкі арэшак (16+).
**0.15** Цар (16+).
**2.30** Чатыры таксісты і сабака-2 (12+).
**4.45** Дзяўчына з касой (16+).

## National Geographic

**6.00** Зона будаўніцтва (16+).
**6.25** Неверагодныя машыны (16+).
**7.15, 4.30** Аўта-SOS (16+).
**8.50** Шаша праз пекла (16+).
**11.00** Невядомы Кітай (16+).
**12.40** Секунды да катастрофы (16+).
**13.30, 21.15** «Тытанік»: праз 20 гадоў» (16+).
**14.20, 18.10, 23.40** Выратавацъ «Тытанік» (16+).
**15.05, 1.15** Фатальны пажар на Тытаніку (16+).
**15.50, 19.00, 22.05, 0.30, 2.00** Асушыць акіян (16+).
**22.50** Секунды да катастрофы (16+).
**2.50** НЛА ў Еўропе (16+).

## Discovery

**8.00, 18.00** Як гэта ўстроена? (12+)
**9.00, 19.00** Як гэта зроблена? (16+)
**10.00** Невядомая экспедыцыя (16+).
**11.00** Залатая ліхаманка (16+).
**12.00, 20.00, 2.55** Разбуральнікі легенд (16+).
**13.00, 4.40** Дылетант супраць эксперта (12+).
**14.00, 23.00** Музейныя тайны (12+).
**15.00, 3.50** Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
**16.00, 5.30** Разбуральнік (12+).
**0.00, 7.10** Не спрабуйце паўтарыць (16+).
**1.00** Самагоншчыкі (18+).
**2.00** Гіганцкія хабы (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*

# ЗНАЙСЦІ ГАСПАДАРА ХАЦЕ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

## У Бабруйску лічаць, што Указ № 357 «Аб пустуючых і старых дамах» дазволіць значна палепшыць сітуацыю з праблемнай нерухомасцю

**На апошняй суботняй тэлефоннай прамой лініі ў Магілёўскім аблвыканкаме жыхары вобласці тройчы падымалі пытанне пустуючых дамоў. Якую яны ўяўляюць небяспеку, расказваць не трэба. У тым жа Магілёве некалькі гадоў таму пад плітой закінутага дома, які абрынуўся, загінулі двое дзяцей. Вінаватыя пакараны, але жыцці не вярнуць. Для дэпутатаў тэма пустуючых дамоў — адна з важных, але рэальна паўплываць на рэчаіснасць народныя абраннікі маглі толькі ў межах сельскай мясцовасці. Галоўным іх інструментам пры гэтым быў Указ № 100. Больш вялікія магчымасці дае падпісаны летась замест «сотага» Указ № 357. Ён дазваляе працаваць з праблемнай нерухомасцю нават райцэнтрам і буйным гарадам (за выключэннем сталіцы і абласных цэнтраў). У Магілёўскай вобласці такое права атрымаў і Бабруйск, дзе пражывае больш за 200 тысяч чалавек. Пра тое, як закон дапаможа дэпутатам у рабоце, у нашай размове са старшынёй Бабруйскага гарсавета дэпутатаў Міхаілам ЖАЛУДОВЫМ.**

— Зараз вывучаюцца ўсе пытанні, звязаныя з пустуючай маёмасцю, — паведаміў ён. — На сёння ў Бабруйску выяўлена 260 дамоў з прыкметамі таго, што яны не выкарыстоўваліся для пражывання працяглы перыяд. Але, каб такі дом паставіць на ўлік як пустуючы і безгаспадарны, трэба правесці дастаткова складаную працэдуру.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Зараз можна больш плённа працаваць з такімі дамамі. Для горада гэта будзе добрая магчымасць папоўніць бюджэт і зрабіць нешта карыснае для людзей.

**— І як бабруйскія дэпутаты працавалі з такімі дамамі?**

— Гэтыя дамы нясуць небяспеку перш за ўсё для тых, хто жыве побач. І людзі перыядычна звярталіся да нас з такімі пытаннямі. Раней мы маглі толькі папрасіць гаспадароў неахайнай маёмасці навесці парадак або пахадайнічаць, каб ім далі прадпісанні. Неадназарова разглядалі пытанні па пустуючых дамах на розных камісіях, у тым ліку і канкрэтныя сітуацыі, калі там на пажарах гінулі людзі або калі збіраліся кампаніі для распіцця алкагольных напояў. Для горада гэта вельмі сур'ёзная праблема.

**— Зараз дэпутатам стане прасцей вырашыць пытанне?**

— Перакананы ўласніка дакладна будзе прасцей. Закон дазваляе дом знесці або прадаць праз суд. Але гэтым будуць займацца прафесіяналы, людзі якія, маюць паўнамоцтвы дзейнічаць у рамках заканадаўства. Пры Бабруйскім гарвыканкаме існуе спецыяльная камісія па абследаванні старых і пустуючых дамоў. Туды ўваходзяць прадстаўнікі землеўпарадкавальнай службы, жыллёва-камунальнай і гэтак далей — усе тыя, якія могуць рэальна ацаніць стан пабудовы. Менавіта камісія будзе вырашаць, з'яўляецца дом пустуючым і старым або не. Мы ж нават не можам прызнаць дом старым. Але, паўтаруся, для дэпутата вельмі важна, каб з такой маёмасцю было прасцей разабрацца. Праблема не толькі ў тым, як выглядае гэты дом, але і ў тым, якую пагрозу ён нясе. Бабруйск на працэнтаў 30 — гэта прыватны сектар. І закінутыя дамы прыцягваюць увагу людзей асацыяльнага ладу жыцця.

Нядаўна мне патэлефанавалі, каб паведаміць пра чарговы праблемны дом па вуліцы Бярэзіна. Гаспадары не карыстаюцца сваім жыллём, іх участак зарос пустазеллем. І тое, што яны жывуць у другім горадзе, не вызваляе іх ад адказнасці за кінутую без нагляду маёмасць. Раней на такіх уласнікаў складалі пратакол, пісалі лісты, але гэта была вельмі доўгая працэдура і малаэфектыўная. Зараз можна сказаць адкрытым тэкстам, што пры такіх адносінах дом можа стаць безгаспадарным, пустуючым. А калі яго таксама ніхто не прызнаюць і пасля гэтага на працягу года там не з'явіцца чалавек, дом можа быць знесены або выстаўлены на продаж. Што датычыцца дома па канкрэтным адрасе, то ім пакуль зоймецца камунальная служба і навядзе вакол яго парадак. А калі аб'явіцца гаспадар, яму, акрамя ўсяго астатняга, прыйдзецца кампенсаваць і гэтыя выдаткі.

Раней мы маглі толькі папрасіць гаспадароў неахайнай маёмасці навесці парадак або пахадайнічаць, каб ім далі прадпісанні.

**— Які ўдзел прымалі бабруйскія дэпутаты ў распрацоўцы ўказа? Ці былі канкрэтныя пажаданні, заўвагі?**

— Калі разглядалі пытанні па старым жыллі, мы перш за ўсё ставілі перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу задачу ўнесці змяненні ў «соты» ўказ, каб яго дзеянне распаўсюджвалася і на гарадскую мясцовасць. Гэта было практычна невырашальнае пытанне, паколькі маёмасць прыватная, і мы не маглі паўплываць на ўласніка. Пытанне было яшчэ вось у чым. Паўразбураны дом стаіць, у спадчыну ніхто не ўступае, а як толькі вакол яго пачынаюцца нейкія дзеянні, тут жа з'яўляецца ўласнік. Ён мог аформіць на сябе ўсё тое, што засталося ад дома, і прад'явіць прэтэнзіі, у тым ліку і да камунальных службаў. Рызыка існавала вялікая. Закон быў на баку ўласніка. Нават калі дом ледзь ліпеў. Зараз можна больш плённа працаваць з такімі дамамі. Для горада гэта будзе добрая магчымасць папоўніць бюджэт і зрабіць нешта карыснае для людзей.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### ❍ У тэму

**Магілёў — абласны цэнтр, і на яго дзеянне Указа № 357 не распаўсюджваецца. Між тым у горадзе хапае прыватнага сектара, і праблема з пустуючымі дамамі таксама вельмі актуальная.**

— На тэрыторыі нашага мікраёна — 18 вуліц і завулкаў, і практычна ўсюды ёсць безгаспадарныя закінутыя дамы. Што з імі рабіць, невядома, — паскардзіўся нядаўна **Віталь ГАРДЗЕЕЎ, старшыня мікразоны № 5.** — Звяртаюся ў розныя інстанцыі — міліцыю, ЖКГ, архітэктуру, але толку мала. Вось не так даўно жыхары вуліцы Валгаградскай паведамілі, што ў закінутым доме пад нумарам № 50 збіраюцца аматары выпіць. Пабываў на месцы і прыйшоў у жах. Раней вакол дома была агароджа, а зараз яе няма. І смецця нанесена столькі, што трэба машына, каб усё гэта вывезці. Патэлефанаваў камунальнікам — прыедзьце, прыбярыце. Але ж гэта не вырашэнне праблемы. Трэба з сітуацыяй нешта рабіць.

# Колькі каштуе дом знесці?

## Нятанна, аднак. Знос адной старой пабудовы разам з добраўпарадкаваннем тэрыторыі ў сярэднім абыходзіцца ў 1,5 тысячы рублёў

**З пачатку года ў Гомельскай вобласці ўцягнута ў сельскагаспадарчы абарот больш за 60 гектараў зямель, якія вызваліліся пасля зносу старых і пустуючых будынкаў. Летась — 710 гектараў такіх зямель. Па словах старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярыны ЗЕНКЕВІЧ, выяўленне пустуючых і старых будынкаў у рэгіёне носіць сістэмны характар:**

— Сёлета на Гомельшчыне 42 такія дамы зняты з уліку без зносу — у іх уласнікі навялі парадак. Ужо ў гэтым годзе было знесена 311 старых і пустуючых дамоў. Летась — 2,5 тысячы. А з 2012 года — каля 17 тысяч. Гэта работа адбываецца пастаянна. У наш час у абласным банку даных знаходзіцца звыш пяці тысяч такіх пабудоў.

Між тым сярэдні кошт зносу аднаго домаўладальніцтва з добраўпарадкаваннем тэрыторыі складае 1,5 тысячы рублёў. Пасля зносу праблемных пабудоў выконваецца рэкультывацыя вызваленых зямель. На гэтых плошчах праводзяцца работы для будучага выкарыстання ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Акрамя таго, там з'яўляюцца дзіцячыя, спартыўныя гарадкі і зоны адпачынку.

Мясцовыя органы ўлады атрымалі шырокія магчымасці па выкарыстанні безгаспадарных пабудоў.

Работа са старымі і пустуючымі дамамі з'яўляецца важным элементам добраўпарадкавання населеных пунктаў. Навядзенне парадку на зямлі праводзіцца ва ўсіх раёнах вобласці планамерна. Яно ўключае і азеляненне населеных пунктаў, мастацка-эстэтычнае афармленне, навядзенне парадку на сельскагаспадарчых землях, на тэрыторыях арганізацый і прамысловых прадпрыемстваў, прысядзібных участках...

Многія мерапрыемствы па навядзенні парадку праходзяць па ініцыятыве дэпутатаў Саветаў розных узроўняў. Добраўпарадкаваннем актыўна займаюцца ўсе жыхары рэгіёна. Летась на Гомельшчыне прайшло 1,5 тысячы суботнікаў, сёлета адбудзецца не менш. Першачарговая ўвага — навядзенню парадку ў месцах масавага адпачынку, у парках, скверах, на дзіцячых пляцоўках. Не будуць забыты і месцы пахаванняў, у тым ліку мемарыяльныя.

Узаемадзеянне дэпутатаў розных узроўняў і тэрыторый і кіраўнікоў, спецыялістаў службаў, арганізацый, ведамстваў дапамагае выявіць новыя рэзервы для павышэння эфектыўнасці дзейнасці. Праводзіцца работа па напаўненні адзінага пераліку аб'ектаў, дзе неабходна прыняць меры па навядзенні парадку. Для вызначэння кропкавага месцазнаходжання аб'екта выкарыстоўваюцца сучасныя картаграфічныя матэрыялы. Электронная версія адзінага пераліку дазваляе спецыялістам розных структур аператыўна апрацоўваць яе і падтрымліваць у актуальным стане.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Згодна з новым 357-м Указам Прэзідэнта прасцей стала купіць пустуючыя і старыя дамы. Мясцовыя органы ўлады атрымалі шырокія магчымасці па выкарыстанні безгаспадарных пабудоў. Максімальна спрошчаны працэдуры па рэалізацыі такой нерухомасці. Напрыклад, сельсаветы зараз могуць прадаваць пустуючыя і старыя будынкі, не афармляючы на дом поўны пакет дакументаў, напрамую, без аб'яўлення аўкцыёну. Не прыйдзецца вышукваць грошы і на тэхнічную дакументацыю — афармляць яе будзе ўжо новы гаспадар. Пры гэтым указ прадугледжвае максімальную абарону законнага ўласніка. Калі дом прадалі, то ён можа прэтэндаваць на выплату той грашовай сумы, за якую гэты дом быў прададзены. А калі ён быў да таго моманту знесены, то на пакрыццё вартасці.

Двойчы на год спецыяльныя камісіі на Гомельшчыне абследуюць вуліцы гарадоў і вёсак, выяўляючы старыя і пустуючыя дамы. Яны знаходзяць іх гаспадароў і сумесна вырашаюць будучы лёс праблемных будынкаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ЗАМЕСТ ПУСТКІ — ДЗІЦЯЧАЯ ПЛЯЦОЎКА І СКВЕР

## Як грамадская ініцыятыва спрыяе навядзенню прыгажосці на асобным участку зямлі

**У Міжлессі, што ў Бярозаўскім раёне Брэстчыны, пабудавана нямала новых дамоў. А паміж кварталамі забудоў па вуліцах Палявой і Маладзёжнай утварыўся пусты ўчастак зямлі. Ён не падыходзіць пад забудову, яго не адвядзеш пад поле альбо агарод, бо не засееш жа лапік зямлі ледзь не ў цэнтры вёскі. Пэўны час гэты ўчастак проста абкошвалі, але ён паступова дзічэў, з'яўлялася ўсё болей рознага пустазелля. Асабліва непрывабна гэта выглядала пад восень, калі трава пачынае вянуць альбо чэзнуць з першымі замаразкамі.**



Старшыня Міжлескага сельскага Савета Юрый КАШТАЛЯН і трактарыст Андрэй ГАЛУЦ.

### На суботніку

— Неяк на сельскім сходзе прагучала выказванне, што гэты кавалак зямлі даўно просіцца, каб яго акультурылі, — кажа **старшыня Міжлескага сельскага Савета Юрый КАШТАЛЯН**. — Сказана — зроблена. Пачалі з суботніка. Пабач спрэс дамы, у якіх выхоўваюцца дзеці дашкольнага і школьнага ўзросту, патэнцыйныя кліенты пляцоўкі. На суботнік выйшлі бацькі сямействаў, мамы ў дэкрэце, спецыялісты сельгаспрадпрыемства і сельвыканкама. Працавалі як тыя пчолкі, лічы, за дзень тэрыторыю прывялі ў парадак.

Ідэяй загарэўся і кіраўнік ААТ «Міжлессе» Вячаслаў Ярошчык. За кошт гаспадаркі было набыта абсталяванне для дзіцячай пляцоўкі. Потым зрабілі драўляныя лаўкі са сталамі для адпачынку. Прывезлі дошкі і ўсталявалі пясочніцу для самых маленькіх. Цяпер з цяплом у выхадныя дні тут весела і ажыўлена. Школьнікі прыбягаюць паганяць мяч, павісець на турніку. Маці прыходзяць з дзецьмі. Скажам, жанчына прысела адпачыць на лаўцы,назірае за малым, які дрэмле ў калясцы, а старэйшы будуе ў пясочніцы палацы альбо гуляе побач. Паступова пляцоўка становіцца месцам, дзе сустракаюцца суседзі з дзвюх вуліц. Цяпер і ў вёсцы, асабліва маладзейшае пакаленне, не вельмі камунікуюць паміж сабой, бо шмат часу забіраюць інтэрнэтныя стасункі. А тут ёсць магчымасць пагаварыць, абмяняцца думкамі і навінамі, пакуль дзеці гуляюць.

Што важна, самі зрабілі, самі і даглядаюць агульную пляцоўку, — заўважае старшыня сельвыканкама. — Вясной нікога не трэба два разы прасіць, каб выйшлі падфарбаваць альбо прыбраць нешта. Наадварот, людзі праяўляюць творчасць ды ўласную ініцыятыву, каб зрабіць пляцоўку больш прывабнай і цікавай. Скажам, трактарыст Андрэй Галуц знайшоў у полі вялізны валун і даставіў яго сюды. Нехта нават прапанаваў з часам якую-небудзь памятную шыльду на камень прымацаваць. А суседнія гаспадыні раяцца паміж сабой, якія кветкі лепш пасадзіць вясной, каб летам месца адпачынку выглядала яшчэ прыгажэйшым.

### Талакой

І калі ў Міжлессі Бярозаўскага раёна былая пустка стала адмысловай дзіцячай пляцоўкай, то ў Стайках Івацэвіцкага зарослы кустоўем непрывабны куток, які быў цікавы хіба аматарам выпіць далей ад чужых вачэй, стаў скверам.

**Старшыня Стайкаўскага сельскага Савета Мікалай БАСАЛАЙ** расказвае, што тут таксама пачыналі з суботніка. Спачатку расчысцілі тэрыторыю ад лішняй расліннасці, пакідалі толькі сталыя ўстойлівыя дрэвы. З тэхнікай дапамагло мясцовае сельгаспрадпрыемства. Астатняе зрабілі рукі і грамадская ініцыятыва.

Такім чынам, маем прыклад, як амаль без сродкаў можна зрабіць добрую справу талакой. Расчыстка сквера стала першай задачай, з якой жыхары Стаек справіліся. А вось пераўтварыць памаладзелы сквер у месца адпачынку можна было хоць бы паставіўшы лаўкі. Яны ж, як вядома, каштуюць грошай. Тады дамовіліся з суседнім лясніцтвам. Леснікі далі бярвенні як спонсарскую дапамогу. Круглыя дзеравіны распілавалі на дзве часткі, атрымалі лаўкі, у нечым нават эксклюзіўныя.

**Добры пачатак становіцца асновай для працягу і развіцця грамадскай справы. І тады не заўважыш, як нейкая пустка, зарослы бур'янам участак альбо казіная паша ператворацца ў прывабны куток.**

А галоўным завадатарам добраўпарадкавання сквера стаў стараста вёскі Анатоль Трафімчык. Ён знаходзіў умельцаў, якія аздобілі пляцоўку сваімі рукамі і грошай за гэта не папрасілі. Паступова побач з лаўкай з'явіліся драўляныя жырафы і нават скульптуры казачных дзеда з бабай. Некаторым лаўкам для сядзення з дапамогай сякеры прыдалі выгляд самалётаў на радасць дзятве. Далей расфарбавалі старыя бочкі і шыны, з якіх зрабілі новыя кампазіцыі, пайшлі ў справу і розныя закручастыя дрэвы, якія знаходзілі ў лесе. Словам, тыя, хто прыклаў рукі да агульнакарыснага праекта, праявілі фантазію і творчы падыход. Сельвыканкам паклапаціўся пра пясочніцы на новай пляцоўцы. Цяпер сквер стаў месцам адпачынку для вяскоўцаў усіх пакаленняў.

* * *

У дзвюх прыведзеных вясковых гісторыях згадана, як акультурылі былыя пусткі толькі дзякуючы грамадскай ініцыятыве і невялікай спонсарскай дапамозе арганізацый і прадпрыемстваў, якія працуюць на тэрыторыі. У Кобрынскім раёне жыхары пасёлка Птушкафабрыка пры падтрымцы мясцовай улады і грамадскай арганізацыі змаглі атрымаць грант, за сродкі якога купілі арэлі, каруселі, нават невялікі батут, некалькі лавак. Паступова сталі з'яўляцца малыя архітэктурныя формы, арыгінальныя ўпрыгажэнні, а потым адзін прадпрымальнік узвёў збудаванне, якое нагадвае карабель. Пазней разбілі футбольнае поле, расчысцілі месца для валейбольнай пляцоўкі. І з часам на полі, дзе раней пасвіліся козы, з'явіўся грамадскі цэнтр адпачынку.

У Яглевіцкім сельсавеце Івацэвіцкага раёна ініцыятарам добрай справы стаў святар мясцовай царквы. Пад яго кіраўніцтвам прыхаджане зрабілі побач з царквой у Яглевічах дзіцячы гарадок, які абрысамі нагадвае старажытную крэпасць. На шчасце, пералік падобных акцый можна доўжыць. Для добрай справы патрэбна, па-першае, ініцыятыва, па-другое, арганізатар, які зможа павесці людзей. І калі ўдзельнікі талакі ўбачаць першыя вынікі, яны, як правіла, на гэтым не спыняюцца. Добры пачатак становіцца асновай для працягу і развіцця грамадскай справы. І тады не заўважыш, як нейкая пустка, зарослы бур'яном участак альбо казіная паша ператворацца ў прывабны куток.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШЛЕЙФ НЕДАРЭЧНАСЦЯЎ

## Чаму на асушаных землях не падтрымліваецца парадак

**Навядзенне парадку на меліяраваных землях — справа не аднаго дня. Між тым некаторыя карыстальнікі гадамі не праводзяць там аніякіх работ альбо робяць іх толькі часткова. Навошта тады была патрэбна тая меліярацыя? — задаюцца пытаннем у КДК Гродзенскай вобласці. І прыводзяць цэлы шэраг фактаў нерацыянальнага выкарыстання каштоўнага зямельнага рэсурсу.**

Спецыялісты ведаюць — асушаныя землі даюць добры ўраджай, выкарыстоўваюцца пад сенакосы і пашу. З году ў год на ўтрыманне такіх аб'ектаў выдзяляюцца з абласнога бюджэту значныя сродкі. Гэта робіцца, каб землекарыстальнікі падтрымлівалі землі ў належным стане і дабіваліся эфектыўнага выніку. Як вядома, працяглая эксплуатацыя ўплывае на стан меліярацыйнай сістэмы — адбываецца заглейванне каналаў, размыў, абвальванне адкосаў, зарастанне іх травой і кустарнікамі. А такі стан прыводзіць да парушэння аграрэхнічных тэрмінаў сельскагаспадарчых культур, зніжаецца ўраджайнасць.

— Штогод у Гродзенскай вобласці ўкладваецца 12—14 мільёнаў рублёў для правядзення мерапрыемстваў на асушаных землях. Гэта даволі сур'ёзная сума, — кажа **старшыня КДК Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА**. — Таму мы абавязаны спытаць з карыстальнікаў, куды ідуць гэтыя сродкі.

Таксама выяўлены факты неналежнай эксплуатацыі асушаных земляў і сістэмы меліярацыі. Адзін з іх звязаны з сельгаспрадпрыемствам «Мастаўчанка» Мастоўскага раёна. Гаспадарка — у ліку неплацежаздольных і знаходзіцца ў стане банкруцтва. Два гады таму на меліярацыю амаль 110 гектараў было выдаткавана каля 300 тысяч рублёў. Але прадпрыемства аказалася няздольным акультурыць гэту плошчу, і зараз трэцяя частка зямель не выкарыстоўваецца — тут проста расце пустазелле. Бюджэтныя сродкі ўкладзены, а парадку няма.

Такая карціна назіраецца не толькі ў адной гаспадарцы. Кантралёры выявілі падобны факт у астравецкім саўгасе «Падольскі». На асушэнне зямель і рэканструкцыю сістэмы меліярацыі раённаму прадпрыемству «Гроднамеліяводгаса» рэгулярна выдзяляюцца сродкі. Напрыклад, летась на гэтыя мэты было накіравана каля 170 тысяч рублёў. Але не ўсе землі «працуюць». Частка зарастае пустазеллем.

— Не ўсе арганізацыі разлічваюць свае сілы пры правядзенні меліярацыі, — лічыць Анатоль Дарожка. — Некаторыя складаюць планы, ім выдзяляюцца сродкі, а потым высвятляецца, што яны не могуць іх паўнавартасна ўтрымліваць. Ёсць заўвагі і па абслугоўванні самых каналаў.

У асноўным гаворка ідзе аб зарастанні водных артэрый. Не ўсюды вядзецца эфектыўная работа па абкошванні схілаў і тэрыторыі берагоў. Такія факты выяўлены на некалькіх меліярацыйных аб'ектах Іўеўскага і Карэліцкага раёнаў.

У КДК канстатуюць: штогод даныя па асушаных землях розныя, што сведчыць аб іх неналежнай інвентарызацыі. Розніца плошчаў у розных крыніцах даходзіць да 2,5 тысячы гектараў. Недапушчальным, на думку кіраўніцтва абласнога камітэта дзяржкантролю, з'яўляецца і такі падыход, як разлік на маламагутныя механізмы пры распрацоўцы праектаў. І хоць такіх механізмаў там няма, гэта дазваляе атрымаць дадатковыя сродкі з бюджэту.

З парушэннем бюджэтнага заканадаўства вялося добраўпарадкаванне Аўгустоўскага канала. На гісторыка-культурным аб'екце, які цікавяцца турысты, увесь час вядуцца работы па захаванні яго ў належным стане. Гэта і рамонтныя работы, і пакосы, і прыборка смецця, ліс-



ця на прыдатнай тэрыторыі. На гэтыя мэты ўтрымальніку канала — прадпрыемству «Гроднамеліяводгас» — на працягу трох гадоў было выдзелена 570 тысяч рублёў. Але высветлілася, што сродкі атрыманы з парушэннем бюджэтнага кашторысу і фінансы паступалі незаконна. У выніку — фінансаванне па ўтрыманні канала скарацілася на гэтую суму.

Супраць службовых асоб прадпрыемстваў меліярацыйных сістэм заведзены і шэраг крымінальных спраў. У Смаргонскім раёне — у адносінах да галоўнага бухгалтара прадпрыемства, у Мастоўскім — супраць былога дырэктара, які незаконна атрымаў прэмію ў памеры 1,8 тысячы рублёў.

Анатоль Дарожка адзначыў, што па выніках праверкі прадпрыемству «Гроднамеліяводгас» «урэзана» фінансаванне на 920 тысяч рублёў. Каля 250 тысяч сэканомлена і накіравана ў бюджэт. Да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнута дзевяць службовых асоб.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# НА ШПАЦЫР — З БАЛКОНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Ліст ад гродзенцаў, дзе абодва сямейнікі — людзі з абмежаванымі магчымасцямі, — для дэпутата стаў сігналам да дзеяння. Ён узяўся сам абыходзіць усе інстанцыі. Выйшаў з прапановай да сваіх калег — дэпутатаў гарсавета.

Народныя абраннікі на сесіі праект падтрымалі. Было вырашана выдзеліць 16,5 тысячы рублёў на ўстаноўку пад'ёмніка. Сродкі паступілі са спецыяльнага фонду па стварэнні безбар'ернага асяроддзя.

## І СПРАВА ПАЙШЛА...

Нядаўна Сяргей Каляда патэлефанаваў і паведаміў, што праект завершаны. Пад'ёмнік устаноўлены, і можна паглядзець, як ён працуе, тым больш што гаспадары не супраць прыняць гасцей.

І вось мы каля дома, які знаходзіцца амаль што ў самым цэнтры горада. Стары пяціпавярховік капітальна адрамантаваны і выглядае даволі прэзентабельна. Пакуль шукаю вачыма пад'езд, Сяргей Іванавіч накіроўваецца да балкона. І нездарма. Менавіта тут усталяваны той самы доўгачаканы пад'ёмны механізм, аб якім марылі Васіль і Жанна. З яго дапамогай мы трапляем адразу ў залу кватэры.

— Напачатку была ідэя ўсталяваць пад'ёмнік у пад'ездзе. Для гэтага трэба было поўнасцю рамантаваць уваходную групу, — расказвае падчас пад'ёму Сяргей Каляда. — Але камунальнікі, якія выконвалі гэты праект, прапанавалі сваё рашэнне — балкон. І, як бачыце, атрымалася вельмі ўдала.

Васіль сустракае каля дзвярэй і накіроўваецца ставіць чайнік. Адначасова каментуе ход работ па ўстаноўцы пад'ёмніка:

— Зроблена проста шыкоўна! Я нават не думаў, што будзе асобны, аўтаномны механізм з балкона і гэта не стане напружваць суседзяў, бо ў нас вельмі малы лесвічны пралёт. Дарэчы, такую сістэму прапанаваў намеснік дырэктара гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі Сяргей Сямашка, з якім мы трымалі сувязь. Даводзілася вырашаць пытанні, якія ўзнікалі спантанна. З намі раіліся, як лепш зрабіць. У выніку ўсё зроблена якасна, з душой.

Васіль прызнаўся, што сам вырашыў збіраць грошы на пад'ёмнік. Нават шукаў адпаведныя механізмы ў інтэрнэце — вертыкальныя, нахільныя. Але сабраць пэўную суму наўрад ці здолеў бы. Да таго ж прыйшлося б узгадняць з суседзямі, мадэрнізаваць тамбур. Новы варыянт дазволіць нікога не турбаваць.

Разам з пад'ёмнікам зрабілі дарожку, якая выкладзена пліткай. Па ёй можна з'ехаць ад балкона на вуліцу ў любым кірунку без праблем.

## НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ЗА ПАРОГАМ

Планаў на гэты сезон нямала. Васіль і Жанна — сябры грамадскай арганізацыі інвалідаў-калясачнікаў, яны прымаюць удзел у многіх мерапрыемствах і акцыях. Дарэчы, менавіта падчас такіх сустрэч Васіль і пазнаёміўся з Жаннай, пасля чаго яны сталі жыць разам.

— Мы знаёмыя 15 гадоў. Раней я быў дужэйшы, мог пацыху ісці сам і спускаць па пандусе каляску з Жаннай. Лягчэй было і ў машыну сесці. Зараз усё складаней. Калі прасядзець у кватэры два-тры гады, гэта адаб'ецца на здароўі: і дыхавіца, і ацёкі з'явяцца, і не хапае свежага паветра.



Васіль зноў і зноў вяртаецца да тэмы пад'ёмніка. І гэта зразумела. Бо раней ім прыходзілася дагаворвацца з пляменнікам альбо з сацыяльным работнікам, каб своечасова паспець на тую ж сустрэчу ў таварыстве альбо на прызначаны час да доктара. Ці мала куды яшчэ. А зараз гэта сітуацыя змянілася, яны самастойна могуць выйсці з кватэры.

— Безбар'ернае асяроддзе пачынаецца з парога кватэры, — лічыць Васіль. — Гэта галоўны бар'ер, калі ён ёсць, я не магу скарыстацца ніводным аб'ектам у горадзе. І калі пачаць вырашаць гэту праблему для людзей, трэба адштурхоўвацца ад парога.

Многія сацыяльныя праблемы павінна вырашаць і само таварыства, але ў яго мала магчымасцяў, адрозненне ад дэпутатаў, разважае Васіль. Таму тут больш акцэнт робіцца на тэматычных сустрэчах, каб людзі з абмежаванымі магчымасцямі проста выбіраліся з дому і не былі пасіўнымі. Дарэчы, Васіль скончыў інстытут, працаваў на заводзе інжынерам і зараз працуе дыстанцыйна — праектуе сістэму сігналізацыі.

## ГОРАД, ЗРУЧНЫ ДЛЯ ЎСІХ

Васіль лічыць сябе патрыётам свайго горада і марыць аб тым, як будзе некалі вадзіць у музей дзетак сваіх пляменнікаў і расказваць ім гісторыю Гродна. З тэленавін ён ведае аб зменах, якія адбываюцца з гістарычнымі аб'ектамі горада, у прыватнасці, як мяняюцца падчас рэканструкцыі Стары замак, Каложа. Але хоча паглядзець на гэта сваімі вачыма. Жанна марыць пабываць на фестывалі нацыянальных культур, што праходзіць у Гродне. Для дальніх вандровак у яе ёсць электрычная

> У новых дамах безбар'ернае асяроддзе — ужо норма. Але для старых, якіх у Гродне тысячы, не ўсюды ёсць магчымасці для перабудовы як па пажарных, так і па тэхнічных нормах.

каляска, новая, але ўжо выпрабаваная. У найбліжэйшы час жанчына хоча адправіцца ў цэнтральны гарадскі парк, праехаць па дарожках, наведаць кафэ...

— Каляска ды пад'ёмнік — і чалавек ужо не адарваны ад грамадства, уліўся ў соцыум. Жыццё набывае новы сэнс, — упэўнена Жанна.

Разам с суседкай яна плануе заняцца добраўпарадкаваннем новай тэрыторыі каля пад'ёмніка. Дэкаратыўнымі раслінамі абяцалі дапамагчы навучэнцы каледжа, што знаходзіцца побач.

Сяргей Каляда расказаў, што ў горадзе хутка з'явіцца яшчэ адзін аб'ект з безбар'ерным асяроддзем. У рамках трансгранічнага праекта вядзецца ўзнаўленне былога гістарычнага будынка пад гарадскую ратушу. Тут будуць і пандусы, і пад'ёмнікі. У будучым ёсць намер заняцца праектам з улікам набыцця спецыяльных байдарак для інвалідаў-калясачнікаў. Іх можна набыць у Польшчы.

Што датычыцца горада, тут распрацаваны генеральны план, які ўлічвае безбар'ернае асяроддзе. Будуць пашырацца дарогі, рамантавацца масты. На вуліцах пачалася работа па зніжэнні бардзюраў. Гэта робіцца паўсюдна, у тым ліку і ў старым горадзе.

У новых дамах безбар'ернае асяроддзе — ужо норма. Але для старых, якіх у Гродне тысячы, не ўсюды ёсць магчымасці для перабудовы як па пажарных, так і па тэхнічных нормах, паведамілі ў ЖКГ. Зараз у горадзе ўладкавана пяць пад'ёмнікаў, з такой жа просьбай звярнуліся яшчэ дзесяць чалавек. Прыклад Васіля і Жанны сведчыць аб тым, што праблема пры жаданні можа вырашыцца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**


**Извещение**
**о проведении 23 апреля 2019 года**
**повторных торгов по продаже имущества,**
**принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»**

Сведения о продаваемом имуществе

| Номер предмета торгов | Информация о предмете торгов | Стартовая цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 110/С-91200 (назначение — здание специализированное автомобильного транспорта; наименование — гараж) общей площадью 21,0 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 141000000001004883. Местоположение: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Пролетарская, д. 32/2 | 4248,00 | 424,80 |

**Продавец имущества:** открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

**Организатор торгов:** консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.

Повторные торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в повторных торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» № BY23BAPB30122013100380000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, код BAPBBY2X, УНП 190982374 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Повторные торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Повторные торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе повторных торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если повторные торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном условиями проведения торгов. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 20 банковских дней со дня проведения торгов.

**Повторные торги проводятся 23 апреля 2019 года в 12.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Советская, д. 150.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 05.04.2019 по 19.04.2019 включительно, в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, mail: torgi@agroconsult.by. Телефоны для справок: Tel/Fax +375-17-3996639, MTS +375-29-8166446, VEL +375-44-5406446.



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении открытого аукциона**
**по продаже автомобилей, принадлежащих**
**государственному предприятию «Белгеодезия»**

| № Лота | Описание | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 1 | VOLVO S80 (легковой седан), кузов (рама) № YV1AS565091102013, г. в. – 2008 | 6 013,42 | 600,00 |
| Лот 2 | RENAULT KANGOO (легковой специальный универсал), кузов (рама) № VF1KW0YB547825889, г. в. – 2012 | 5 047,56 | 550,00 |
| Лот 3 | VOLKSWAGEN PASSAT (легковой седан), кузов (рама) № WVWZZZ3CZ8E042621, г. в. – 2007 | 4 549,87 | 500,00 |
| Лот 4 | UAZ 390994 (грузопассажирский вагон), кузов (рама) № XTT39099480424617 / 37410080445936, г. в. – 2007 | 2 030,65 | 200,00 |

**Местонахождение**: г. Минск, ул. Олешева, 10, 12. **Шаг аукциона –** 5 %

**Условия аукциона:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона. 2. Условия оплаты: предоплата 70 % не позднее 3 (трех) банковских дней с даты заключения договора купли-продажи, 30 % в течение 3 (трех) банковских дней с момента передачи Объекта (Объектов) по акту приема-передачи. 3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона и стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609, составляет 1 000,00 бел. руб.

**Аукцион состоится 14.05.2019 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: государственное предприятие «Белгеодезия», г. Минск, ул. Машерова, д. 17, тел. 8 (017) 334-79-49. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, помещение 9.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего государственному предприятию «Белгеодезия», проводимом **14.05.2019**. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – **11.05.2019** в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Данченко Денис Николаевич, тел. 8 (044) 771-07-46

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-59 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

# ВЕЛАДАРОЖКА, КУЛЬТУРНЫ КОМПЛЕКС І ТЫСЯЧЫ ДРЭЎ




Цэнтральная плошча — любімае месца адпачынку жыхароў Бараўлян.

**Апошнія гады вёска Бараўляны і аграгарадок Лясны, што ў Мінскім раёне, вельмі змяніліся. Тут адбыліся маштабныя рэканструкцыя і добраўпарадкаванне.**

— У межах рэканструкцыі добраўпарадкавалі дваццаць чатыры дваровыя тэрыторыі, пабудавалі там дадаткова больш як трыста парковачных месцаў для машын, акрамя таго, адрамантавалі дзіцячыя гульнявыя пляцоўкі, тратуары, пешаходныя дарожкі, з'явілася таксама сучасная веладарожка, — расказала **старшыня Бараўлянскага сельвыканкама Жанна ВАРАБЕЙ.** — Значны рамонт праведзены ва ўстановах адукацыі, аховы здароўя, як звонку будынкаў, так і ўнутры. Наша задача захаваць тое, што зроблена, і прымножыць, каб людзям стала яшчэ больш камфортна жыць і працаваць. Таму перш за ўсё звяртаем увагу на санітарны стан, належнае ўтрыманне, добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, тэрыторый, што прылягаюць да прыватных уладанняў, якіх у сельсавеце налічваецца больш за чатыры тысячы.

— Калісьці ў цэнтры пасёлка Лясны стаяла вялікая лужына. Яе засыпалі і з нуля пабудавалі цэнтральную плошчу з лаўкамі, сцэнай. Разам з бульварам і скверам яна ўяўляе адзіны культурны комплекс, дзе ладзяцца шматлікія святы, канцэрты, мерапрыемствы, ставіцца навагодняя ёлка, — не без гонару адзначае **намеснік старшыні сельвыканкама Сяргей КАНДРАШЫН.**

Бараўляны заўжды славіліся сваёй зялёнай зонай. І цяпер таксама пры добраўпарадкаванні робяць акцэнт на азеляненні. Перш за ўсё розныя віды кустоў высаджваюць паблізу шматкватэрных жылых дамоў, у дварах, дзе забаўляюцца дзеці, бавяць час пажылыя. Шмат дрэў высаджваюць паўз дарогі. Напрыклад, мінулай восенню больш за тысячу саджанцаў ліставых парод з'явіліся абапал аўтатрасы Р40, якая праходзіць праз Бараўляны.

Гэты населены пункт цяжка назваць вёскай у традыцыйным разуменні гэтага слова. Яна злілася з пасёлкам Лясны і разам з ім уяўляюць практычна горад, дзе жывуць 45 тысяч чалавек, а на тэрыторыі сельсавета афіцыйна зарэгістравана каля шасцідзесяці тысяч жыхароў і налічваецца васямнаццаць населеных пунктаў. Вядома, каб трымаць на такой тэрыторыі парадак, неабходная сістэма.

— Надзейныя памочнікі ў пытаннях навядзення парадку на зямлі і добраўпарадкавання старасты, старшыні таварыстваў уласнікаў, жыллёвых кааператываў, юрыдычныя асобы. Яны на месцах арганізуюць работу са сваім персаналам, — кажа Жанна Варабей.

— У Бараўлянах была праблема з вулічным асвятленнем, паколькі прыбішоў у непрыгоднасць кабель. Камунікацыі замянілі, паставілі слупы. І цяпер у цёмны час сутак на вуліцах светла. Акрамя таго, у вёсцы не было ліўневай каналізацыі. Пасля дажджу, у веснавое разводдзе вада залівала населены пункт. І гэтае пытанне вырашылі. Зладжаная і сістэмная работа па навядзенні парадку і добраўпарадкаванні залежыць ад каманды, падбору добрасумленных кадраў, — лічыць **старшыня жыллёва-будаўнічага вытворчага кааператыва «Наш дом — 2006» Уладзімір ПАЛЯНЮК**, які працуе ў цесным звязцы з мясцовымі ўладамі. — Мы дапамагаем ім, а яны — нам. Вось толькі нічога не можам зрабіць з так званымі «падснежнікамі» — машынамі, якія гадамі стаяць у дварах і ржавеюць. На іх уладальнікаў няма ўправы: прыватная ўласнасць, і па заканадаўстве мы не маем права прыбраць транспарт, і тут на дапамогу прыходзіць улада. З усім астатнім можна справіцца талакой.



На такіх гульнявых пляцоўках заўжды шмат малых.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

ІНІЦЫЯТЫВА

# ЛІПКАЯ СПРАВА, або Як школа ратавала парк

**Размовы пра тое, што старажытны парк у горадзе Дуброўна трэба ратаваць, вяліся гадамі. Сюды хадзілі адпачываць, некаторы час тут нават працавала танцпляцоўка. Але паступова ён зарастаў і пакрываўся смеццем. І ператварыўся парк «Ліпкі» ва ўтульнае месца, нарэшце змагла... школа. Дакладней, дзеці і настаўнікі змаглі запаліць усіх мясцовых жыхароў цудоўнай ідэяй.**

— Важна было данесці да людзей, што мы ўсе — жыхары Дуброўна, і парк — наша спадчына, — заўважае каардынатар праекта «Захаваем спадчыну разам», лідар грамадскай ініцыятывы «Дубрава», якая выйграла грант у межах праграмы «ТАНДЭМ IV», **Сяргей ЦІЦЯНКОЎ.**

Спачатку некаторыя дубровенцы да праекта ставіліся з недаверам. Знаходзіліся і тыя, хто абураўся: як працаваць, калі за гэта нічога не заплацяць. На першы суботнік выйшла нямнога людзей. Пераважна працавалі школьнікі. Мясцовая газета нават выступіла з гнеўным артыкулам, прысвечаным «ліпкай справе»: маўляў, як можна абыякава ставіцца да такой важнай задачы. Але на работы па добраўпарадкаванні актывісты працягвалі выходзіць, і з кожным суботнікам людзей прырастала. І хутка ў «Ліпках» справа закіпела. Мясцовыя прадпрыемствы дапамаглі з транспартам, рабочыя клалі сцежкі. Быў завезены пясок. З'явіліся валейбольная пляцоўка, альтанка, сцэна, трэнажорны комплекс з навесам, каб трэніравацца можна было ў любое надвор'е. Было пасаджана сто ліпак.

Не дзіва, што многія гарадскія мерапрыемствы зараз «перамясціліся» ў парк. Але не менш важна і тое, што гэты праект змяніў свядомасць людзей. «Чаму ў вас дома ці на ўчастку чыста і прыгожа, а калі ступіць далей, усё дрэнна? Як пашырыць гэтыя межы? — дзеліцца Сяргей Ціцянкоў. — Я працую ў школе і заўважыў, што, калі мы разам саджалі дрэвы, прыбіралі тэрыторыю, у такіх месцах парадак даўжэй захоўваўся. Чалавек, дзе папрацаваў, не смецiць. І адна з мэт нашага праекта — фарміраванне экалагічнай культуры».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 720/С-14912, наименование – гараж, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, площадью 30 кв. м, 1992 г. п., расположенное по адресу: Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, район «Белый ручей» № 45-Л, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 722050100001006631. Составные части и принадлежности: одноэтажный кирпичный гараж с погребом. **Нач. цена:** 2478,60 бел. руб. Задаток: 247,86 бел. руб.

**Условия:** 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. Победитель аукциона, единственный участник за счет собственных средств осуществляет государственную регистрацию незарегистрированных составных частей и принадлежностей в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **www.marketvit.by**. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении юридическое лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенная доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи; организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе); организациями – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на русский или белорусский языки; представителями организаций и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Повторный аукцион состоится 22.04.2019 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** в рабочие дни с 05.04.2019 по 19.04.2019 с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 7). Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» от 17.01.2019. **Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit. by.**

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ИСКРА-М»**

**РБ, 220075, г. Минск, п/у Шабаны, ул. Инженерная,1 А.**
**тел. 3442653, факс 3443902, р/с BY98MTBK30120001093300062909**
**в ЗАО «МТБанк» в г. Минске, БИК MTBKBY22**
**ОКПО 14596516, УНН 100018385**

Дополнение к бухгалтерской отчетности ОАО «Искра-М» по итогам работы за 2018 год, опубликованной в газете «Звязда» № 63 от 04.04.2019 г.

… Годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Искра-М» по состоянию на 31 декабря 2018 г., финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством РБ.

**Открытое акционерное общество «Белхим» (220048, г. Минск, ул. Короля, 34) сообщает о решении очередного общего собрания акционеров ОАО «Белхим» от 29.03.2019**

Выплатить дивиденды за второе полугодие 2018 года в расчете на одну акцию – 0,09619485 бел. руб.

Срок выплаты дивидендов: не позднее 2 мая 2019 г.

Порядок выплаты дивидендов:

физическим лицам – путем зачисления на лицевые счета;

юридическим лицам – путем перечисления на расчетный счет.

УНП 100122846

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк квитанции о приеме наличных денежных средств по обязательному страхованию строений, принадлежащих гражданам формы 1-СУо серии КО № 6031345, **считать недействительным.**

УНП 100122726.

Печать и свидетельство о государственной регистрации ООО «АгроПром-Л» **считать недействительными в связи с утерей.** УНП 193138741

**РУП «Торговый дом «Восточный» вносит изменение в извещение, опубликованное в газете «Звязда» № 61 от 02.04.2019, по лоту № 19:** начальная цена продажи – 7 776,00 рубля, задаток – 777,60 рубля.

УНП 101127633

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 4 красавіка 2019 года.**